Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

25 ЛЮТАГА 2014 г. АЎТОРАК № 35 (27645) Кошт 1800 рублёў

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА



У госці да “рабінзона” з-пад Віцебска

СТАР. 5



Хто купіць сядзібу Манюшкі

СТАР. 6



Гонкі на сабачых запрэжках

СТАР. 8

# З СОНЦАМ У РУКАХ

## вярнуліся з Сочы нашы героі-алімпійцы



Фота Надзеі БУЖАН.

**Дзясяткі беларускіх балельшчыкаў учора ўвечары ў Нацыянальным аэрапорце сустракалі спартыўных герояў краіны.**

Школьнікі прагульвалі ўрокі, студэнты — заняткі ва ўніверсітэтах, а нехта наогул адпрасіўся з працы. Аднак у гэты дзень даравацць ім можна было многае. Алімпійскія чэмпіёны Сочы Дар'я Домрачава, Антон Кушнір, Ала Цупер і бронзавы прызёр Надзея Скардзіна сапраўды заслужылі шчыры, святочны прыём. І нягледзячы на тое, што спецрэйс спазняўся, ніхто аэрапорт не пакідаў, усе да апошняга чакалі любімых спартсменаў. Прыехаў павіншаваць алімпійцаў і наш славуты цяжкаатлет, алімпійскі чэмпіён Леанід Тараненка.

— Поспех нашых спартсменаў фенаменальны! Я глядзеў усе алімпійскія спаборніцтвы з удзелам беларусаў, — трымаючы два яркія букеты, кажа Леанід Аркадзевіч. — А біятлон люблю па жыцці. Гэта наогул беларускі від спорту. Раней нашай ударнай сілай былі мужчыны, а цяпер радуюць вынікамі біятланісткі. Яны — цудоўныя, сціплыя дзяўчаты.

Разам з журналістамі сустракала сваю дачку Наталля Кібер, маці Надзеі Скардзіны.

— Мара маёй дачкі здзейснілася, — прызнаецца ўсцешаная мама біятланісткі. — Трэцяе месца для яе было вялікім жаданнем. Яна разумела, на што можа разлічваць. Гэта было неверагодна! У той момант увесь свет змяніўся. Людзі ўсміхаліся, віншавалі і радаваліся за нас. Фініш гонкі я застала ў паліклініцы. Дык уся паліклініка, знаёмыя віншавалі мяне. Дзякуй Беларусі, усім, хто рыхтаваў гэтую перамогу. У сваю чаргу мы «хварэлі», мы маліліся, дасылалі ім у Сочы свае флюіды і энергію.

Перад балельшчыкамі Домрачава і кампанія з'явіліся пад гукі аркестра і апладысменты.

— У мяне яшчэ на пачатку сезона было добрае адчуванне, — прызналася журналістам трохразовая алімпійская чэмпіёнка, Герой Беларусі Дар'я Домрачава. — Я не думала пра колькасць медалёў, якія атрымаецца заваяваць. Думала пра іх якасць. Цяпер гэтыя медалі — тры залатыя сонейкі, якія я вельмі рада трымаць у руках.

— 5 залатых медалёў і 1 бронзавая ўзнагарода — вынік, які кажа сам за сябе. Алімпіяда ў Сочы — самыя паспяховыя зімовыя Гульні ў гісторыі незалежнай Беларусі, — кажа **Аляксандр Шамко, міністр спорту і турызму.** — Мяркую, што для нашай краіны гэта годны вынік. Упэўнены, ён, дзякуючы нашым спартсменам, дасць новы віток развіцця спорту і фізічнай культуры. Будзем чакаць падобных вынікаў і надалей.

Учора ж беларускія алімпійцы, трыумфатары XXII зімовых Алімпійскіх гульняў у Сочы, усклалі кветкі да манумента на плошчы Перамогі ў Мінску.

**Тарас ШЧЫРЫ.**



Фота БЕЛТА.



Фота БЕЛТА.

## Уладзімір Пуцін павіншаваў Аляксандра Лукашэнку з вялікім поспехам алімпійскай зборнай Беларусі

Учора адбылася тэлефонная размова прэзідэнтаў Беларусі і Расіі. Аб гэтым БЕЛТА паведамілі ў прэс-службе кіраўніка беларускай дзяржавы.

Аляксандр Лукашэнка павіншаваў Уладзіміра Пуціна з выдатнымі вынікамі выступлення расійскіх спартсменаў на Алімпіядзе ў Сочы.

У сваю чаргу Прэзідэнт Расіі павіншаваў Аляксандра Лукашэнку з вялікім поспехам алімпійскай зборнай Беларусі.

У ходзе размовы кіраўнікі дзяржаў закранулі актуальныя тэмы двухбаковага супрацоўніцтва.

Прэзідэнты Беларусі і Расіі абмеркавалі таксама сітуацыю ва Украіне і яе значэнне для дзвюх краін.

### ЦЫТАТА ДНЯ



**Максім ШАЎЧЭНКА, расійскі палітолаг, журналіст:**

***— Беларусь адзіная дзяржава, з адзіным народам. Яна не ведае рэгіянальнага канфлікту; палякі, рускія, што жывуць у Беларусі, — гэта грамадзяне сваёй краіны, якія з'яўляюцца патрыётамі сваёй радзімы. Аляксандру Лукашэнку ўдалося сфарміраваць беларускую нацыю са шматнацыянальнага субстрату, таму беларусы падтрымліваюць Прэзідэнта. У Януковіча такой падтрымкі не было.***

### НАДВОР'Е СЁННЯ

| | |
|---|---|
| Брэст | +4° |
| Віцебск | +3° |
| Гомель | +2° |
| Гродна | +4° |
| Магілёў | +3° |
| Мінск | +2° |

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 25.02.2014 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 9730,00 | ■ |
| Еўра | 13370,00 | ▲ |
| Рас. руб. | 274,00 | ▲ |
| Укр. грыўня | 1060,49 | ▲ |

# МІР І СТАБІЛЬНАСЦЬ З'ЯЎЛЯЮЦЦА НАЙВАЖНЕЙШАЙ ЗАВАЁВАЙ СУВЕРЭННАЙ БЕЛАРУСІ

**Прэзідэнт Беларусі ў Дзень абаронцаў Айчыны і Узброеных Сіл усклаў вянок да манумента Перамогі ў Мінску.**

Акрамя таго, да падножжа манумента былі ўскладзены вянкі ад рэспубліканскіх органаў дзяржаўнага кіравання, судоў, Нацыянальнага сходу, Савета бяспекі і Узброеных Сіл, праваахоўных органаў, Мінаблвыканкама і Мінгарвыканкама, Праваслаўнай і Каталіцкай цэркваў, буйнейшых грамадскіх арганізацый рэспублікі, ветэранаў, прадстаўнікоў дыпкорпуса, Выканкама СНД.

Кіраўнік дзяржавы паразмаўляў з прадстаўнікамі дыпламатычнага корпуса і павіншаваў пасла Расіі ў Беларусі Аляксандра Сурыкава з «бліскучай перамогай на Алімпійскіх гульнях».

Пасля Аляксандр Лукашэнка накіраваўся да жыхароў Мінска, якія прыйшлі на мерапрыемства. Як аказалася, сярод іх было шмат педагогаў. Прэзідэнт пацікавіўся хвалюючымі настаўнікаў праблемамі і выказаў сваё меркаванне наконт гэтага. «Цяпер вельмі шмат гавораць аб тым, што настаўнікам быць не прэстыжна. Мне, вядома, балюча гэта чуць», — адзначыў кіраўнік дзяржавы.

Прэзідэнт адзначыў, што даручыў адрэдагаваць правілы прыёму ў ВНУ так, каб даць больш магчымасцяў для паступлення здольным юнакам і дзяўчатам з глыбінкі, якія ў працэсе вучобы могуць паказаць добрыя вынікі, нават у параўнанні са студэнтамі са сталіцы. СТАР. 2



Фота БЕЛТА.

■ Сітуацыя

# АЎТО ПА ДАВЕРАНАСЦІ: ВЫГАДА ЦІ ПРАБЛЕМЫ?

Здзелка куплі-продажу аўтамабіля па генеральнай даверанасці можа прывесці да матання нерваў і матэрыяльных страт

**Аб гэтым папярэджвае старшы памочнік пракурора Гродзенскай вобласці Вячаслаў ІГНАЦІК на падставе сітуацый, у якія трапляюць удзельнікі падобных здзелак па, здавалася б, вельмі выгаднай схеме. Прычым церпяць і прадаўцы, і пакупнікі аўтамабіляў.**




— Вячаслаў Уладзіміравіч, невыпадкова, мусіць, продаж аўтамабіляў па генеральнай даверанасці ў апошнія гады набыў масавы характар. Значыць, выгадна?

— На першы погляд, сапраўды, у выйгрышы абодва бакі такой здзелкі. Новы ўладальнік аўтамабіля можа яго абмяняць, прадаць без узгаднення цаны з уласнікам, на якога зарэгістраваны гэты транспартны сродак — толькі дарыць нельга. Даволі прывабна і тое, што пры продажы аўтамабіля па генеральнай даверанасці не трэба ўказваць грашовую суму здзелкі. Таму пры заключэнні такога дагавора не плаціцца падатак. Акрамя таго, не трэба стаяць у чарзе для зняцця машыны з уліку. Пакупнік можа сам і зняць яе з уліку, і зноў паставіць там, дзе хоча. А прадавец не павінен паведамляць свае даходы ад продажу пры запаўненні дэкларацыі. У такіх «казырных» умовах і цану можна знізіць.

— У чым жа рызыка для ўдзельнікаў падобных здзелак?

— Спачатку пра тое, чым рызыкуе прадавец. Па-першае, яму не трэба забываць, што транспартны сродак — гэта крыніца павышанай небяспекі. Прадаўшы яго па генеральнай даверанасці, уласнік працягвае несці пэўныя абавязкі, адказваць за шкоду, прычыненую гэтым аўтамабілем, калі за рулём быў новы ўладальнік альбо калі той акажацца недасяжным для праваахоўных органаў і суда.

Другое. Як вядома, шмат дзе на дарогах устаноўлены відэарэгістратары, якія фіксуюць нумары машын і перадаюць інфармацыю аб парушальніках у Дзяржаўтаінспекцыю. І не новаму карыстальніку, а менавіта чалавеку, на якога гэты аўтамабіль зарэгістраваны, будуць прад'яўлены прэтэнзіі ў выпадку парушэння правілаў карыстання транспартным сродкам. СТАР. 3

■ Надвор'е

# Напрыканцы тыдня прыгрэе да плюс 12

**І апошні тыдзень каляндарнай зімы прагназуецца не па сезоне цёплым, паведаміла рэдакцыі спецыяліст Рэспубліканскага гідраметцэнтра Мінпрыроды Вольга Фядотава.**

Сёння на фоне павышанага атмасфернага ціску, ападкаў увогуле не прадбачыцца. Максімальная тэмпература паветра ўдзень будзе вагацца ад 1 да плюс 6 градусаў. А вось у сераду і чацвер пройдуць невялікія ападкі (мокры снег і дождж). Месцамі чакаецца туман, уначы і раніцай слабы галалёд, на дарогах галалёдзіца. Мяркуецца, што 26 і 27 лютага ўначы падмарозіць да 0 — мінус 5 градусаў, а на ўсходзе — нават да 7 марозу. Удзень будзе ўжо ад 2 да 8 цяпла, а па паўднёвым захадзе ў чацвер — да плюс 10 градусаў.

У пятніцу на тэрыторыю Беларусі пачне больш актыўна паступаць вільготнае і цёплае паветра з боку паўднёвага захаду Еўропы. Таму ў асобных раёнах прагназуецца дождж і часам мокры снег. Месцамі туман, а ўначы і раніцай у асобных раёнах галалёдзіца. Тэмпература паветра ўначы на пятніцу будзе вагацца ад мінус 4 да плюс 3 градусаў. Удзень стане ўвогуле цёпла, калі чакаецца 2-8 цяпла, а па паўднёвым захадзе — да плюс 9-12 градусаў. Паводле папярэдніх прагнозаў айчынных сіноптыкаў, у першыя дні сакавіка будзе яшчэ цяплей — і ніякіх там «хаўераў».

**Сяргей КУРКАЧ.**

## ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

### ЕС ПРЫЗНАЎ НОВУЮ ЎЛАДУ Ў КІЕВЕ. КРЫМ — НЕ

Новая ўлада ў Кіеве атрымала прызнанне з боку ЕС і ЗША. Акрамя таго, па словах в.а. прэзідэнта Украіны Аляксандра Турчынава, адстаўку Віктара Януковіча лічаць легітымнай і ў ААН. Пазіцыю ЕС сфармуляваў 24 лютага на брыфінгу афіцыйны прадстаўнік Еўракамісіі Аліўе Баі. «Мы паважаем працэдуру, у выніку якой спадар Турчынаў быў упаўнаважаны выконваць ускладзеныя на яго функцыі», — заявіў ён. Па словах прадстаўніка ЕК, «інстытут, які з'яўляецца гарантам дэмакратычнай легітымнасці Украіны, г.зн. парламент, прыняў рашэнне пераважнай большасцю ў мінулыя выхадныя, і мы паважаем дэмакратычнае і законнае рашэнне, прынятае ўкраінскім парламентам». Законнасць адхілення ад улады прэзідэнта Віктара Януковіча прызналі таксама і ў ААН, пра што распавёў сам в.а. прэзідэнта Турчынаў на пагаджальнай нарадзе дэпутацкіх груп і фракцый Вярхоўнай Рады. Акрамя таго, у ЗША лічаць легітымнай змену ўлады ва Украіне. «Мы не прымаем любыя намёкі на тое, што тут адбываецца пераварот, і на тое, што легітымнасць таго, што здарылася, нібыта знаходзіцца пад пытаннем з-за замежнай падтрымкі», — патлумачыў у эфіры аднаго з тэлеканалаў пасол ЗША ва Украіне Джэфры Пайет.

Тым часам у самой Украіне не ўсе так адназначна. Сярод рэгіёнаў найбольш супраціўляецца новай уладзе, якая асацыюецца з татальнай украінізацыяй, Крым. Крымскі парламент, у прыватнасці, прызнаў нелегітымнымі апошнія рашэнні Вярхоўнай Рады — аб адстаўцы Януковіча, новым кіраўніку МУС, вяртанні да канстытуцыі 2004 года і правядзенні ў маі 2014-га датэрміновых прэзідэнцкіх выбараў (прымаць апошнюю пастанову, калі прытрымлівацца літары закона, Рада паўнамоцтваў не мела, паколькі датэрміновыя выбары аб'яўляюцца толькі пры імпічменце прэзідэнта, у выпадку яго смерці або добраахвотнай адстаўкі; ні першага, ні другога, ні трэцяга не адбылося).




### МІНФІН УКРАІНЫ: ПАТРЭБНА 35 МЛРД ДОЛАРАЎ

Кіеў спадзяецца, што цана на расійскі газ не зменіцца ў сувязі з фактычнай зменай улады ва Украіне. Пры гэтым незразумела, чым цяпер Украіна будзе плаціць за расійскі газ. Дзяржаўная казна пустая, краіна даведзена да банкруцтва, пацвердзіў кіраўнік парламенцкай фракцыі «Бацькаўшчына» Арсеній Яцанюк. «Такой фінансавай катастрофы Украіна не ведала за ўсе гады незалежнасці», — заявіў ён на пасяджэнні пагаджальнай рады лідараў фракцый Вярхоўнай Рады, дадаўшы, што «трэба неадкладна прасіць фінансавай дапамогі ў МВФ». Мінфін тым часам ужо падлічыў, што Украіне неабходна 35 мільярдаў долараў дапамогі на працягу 2014-2015 гадоў. У сувязі з гэтым Мінфін прапанаваў міжнародным партнёрам правесці донарскую канферэнцыю з удзелам Еўрасаюза, ЗША, МВФ, іншых краін і міжнародных фінансавых арганізацый для вырашэння пытання аб выдзяленні дапамогі на мадэрнізацыю і правядзенне рэформаў ва Украіне, а таксама на рэалізацыю Пагаднення аб асацыяцыі краіны з ЕС, перадае інфармагенцтва УНІАН.

### МАСКВА НЕ БАЧЫЦЬ ЛЕГІТЫМНЫХ ПАРТНЁРАЎ ВА УКРАІНЕ

Прэм'ер-міністр РФ Дзмітрый Мядзведзеў назваў сітуацыю, якая склалася ва Украіне, небяспечнай для нацыянальных інтарэсаў Расіі. Кіраўнік расійскага ўрада дадаў, што Масква сур'ёзна непакоіцца за жыццё і здароўе сваіх грамадзян ва Украіне. Мядзведзеў адзначыў, што менавіта з гэтым звязана рашэнне адклікаць для кансультацый расійскага пасла ва Украіне Міхаіла Зурабава. «Не мне вам казаць, што гэта азначае ў дыпламатычнай практыцы», — сказаў прэм'ер. Кіраўнік урада заўважыў, што не бачыць зараз легітымных партнёраў ва Украіне, з якімі можна было б наладзіць дыялог. «Калі лічыць урадам людзей, якія ў чорных масках і з аўтаматамі Калашнікава «рассякаюць» па Кіеве, то з такім урадам нам працаваць будзе складана», — дадаў Мядзведзеў. Прызнанне легітымнасці створаных дэпутатамі Вярхоўнай Рады ў апошнія дні органаў іншымі краінамі прэм'ер назваў «аберацыяй свядомасці».

ISSN 1990 - 763X

14035

■ Вызваленне

# ФОРМА І СЭНС

У БДУ прэзентавалі рэтракаляндар да 70-годдзя вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў

**У галоўным корпусе БДУ прайшла акцыя «Мы — нашчадкі Перамогі», якая дала старт цэламу цыклу патрыятычных мерапрыемстваў. «Сёлета мы вырашылі адмовіцца ад традыцыйных фармальных праектаў і зладзіць нешта сапраўды запамінальнае, — распавядае першы прарэктар БДУ Міхаіл Жураўкоў. — Так узнікла ідэя зрабіць нешта такое, што нагадвала б студэнтам і выкладчыкам пра подзвіг беларускага народа. У выніку мы дайшлі да думкі аб'яднаць мінулае і сучаснасць, паказаўшы падзеі таго часу вачыма нашых студэнтаў. Пераапранутыя ў форму салдат Вялікай Айчыннай, юнакі і дзяўчаты стварылі адмысловыя вобразы герояў мінулага, якія захавалі на сваіх старонках наш незвычайны настольны каляндар».** СТАР. 3



# МІР І СТАБІЛЬНАСЦЬ З'ЯЎЛЯЮЦЦА НАЙВАЖНЕЙШАЙ ЗАВАЁВАЙ СУВЕРЭННАЙ БЕЛАРУСІ

**(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)**

Разам з тым Аляксандр Лукашэнка выказаў меркаванне, што ў цэлым у Беларусі «вельмі размахнуліся па вышэйшай адукацыі». Паводле яго слоў, колькасць грамадзян, якія скончылі ВНУ, значна павялічылася нават у параўнанні з савецкім перыядам, а спецыялісты па асобных напрамках аказваюцца проста не запатрабаваны на рынку працы. Пры гэтым у часткі выпускнікоў прысутнічаюць завышаныя чаканні наконт далейшага працаўладкавання. «Дыплом атрымаў, не важна нават як, і ён лічыць, што яму заўтра Лукашэнка павінен даць вялікі стол і крэсла. Не ведаю. Гэта, напэўна, няправільны падыход», — заўважыў кіраўнік дзяржавы.

Што датычыцца неабходнасці амаладжэння кадраў у сферы адукацыі, Аляксандр Лукашэнка выказаў меркаванне, што ў гэтым працэсе нельга дапусціць страты вопыту, які ёсць у выкладчыкаў старэйшага пакалення. Гэта датычыцца і іншых напрамкаў, у тым ліку дзяржаўнай службы. «Таму не трэба спяшацца. Ёсць разумныя юнакі і дзяўчаты, але ім усё роўна патрэбны вопыт, — сказаў Прэзідэнт. — Так, будзем імкнуцца да таго, каб моладзь усё ж такі займалася канкрэтнай справай».

Кіраўнік дзяржавы ў сувязі з гэтым згадаў аб нядаўняй нарадзе па пытанні работы індывідуальных прадпрымальнікаў, многія з якіх у пачатку 90-х гадоў мінулага стагоддзя былі вымушаны прыйсці ў гандаль менавіта са сферы адукацыі. «Яны пастаўляюць сюды тавар і прадаюць на гэтых рынках. Але гэта не справа кандыдата навук і прафесара. Гэта нават не справа чалавека з вышэйшай адукацыяй паехаць, па-старому кажучы, на Чаркізаўскі рынак у Маскву, набраць барахла без усялякіх дакументаў, прывезці сюды і тут прадаць, — лічыць Аляксандр Лукашэнка. — Хоць гэта праца цяжкая. Але трэба прыходзіць да цывілізаванага стану. І, вядома, пакрыўдзіць іх таксама нельга. Але я ім прама сказаў: майдана не будзе ў Беларусі».

Размаўляючы з грамадзянамі, Прэзідэнт падрабязна спыніўся на падзеях, якія адбываюцца ва Украіне. «У іх свае праблемы. Майдан для нас не навіна. Гэта ж не першы раз і, вы ведаеце, з першымі майданаўцамі (Віктар Ючшанка і іншыя) я да гэтага часу дружны. У іх свае пытанні, у нас — свае, і мы будзем на гэтым будаваць сваю палітыку. У іх свая дзяржава, а ў нас — свая», — сказаў беларускі лідар.

«У нас адзіныя мэты па Украіне. Украіна павінна быць цэласнай. Ніхто не павінен раздзярбаніць гэту вялікую краіну, яна нам не чужая». Паводле слоў Прэзідэнта, не варта перажываць за тое, што падзеі, якія здарыліся там, могуць паўтарыцца ў нас. Трэба перажываць за тое, што нашы людзі там перажываюць гэты цяжкі крызіс. «Гэта вельмі цяжка, і гэта толькі пачатак», — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка.

«Прыгожа на плошчы можна гаварыць, можна заклікаць да чаго заўгодна. Але заўтра ж пачнуцца пытанні эканомікі, фінансаў. Людзям трэба плаціць пенсіі, зарплаты, даць работу. Вось якія пытанні заўтра стануць перад рэвалюцыянерамі», — адзначыў Прэзідэнт Беларусі.

«Таму, калі ўсё па-добраму, па-мірнаму, нам наканавана жыць з імі ў дружбе і згодзе», — сказаў кіраўнік дзяржавы.

Аляксандр Лукашэнка нагадаў, што нешта падобнае да ўкраінскага майдана спрабавалі зрабіць і ў Беларусі ў 2010 годзе. «Цяпер наш народ зразумеў, што магло б быць, калі б гэта дапусцілі. Але мы ж ні вадой іх не палівалі, ні слёзатачывы газ не прымянялі, нікому нічога не ламалі. Але калі ты дакрануўся да ваеннага чалавека, міліцыянера, спецназаўца, які вас спрабуе там разняць, адказ будзе імгненны, — сказаў Аляксандр Лукашэнка. — Як я магу дазволіць, каб ваеннаму чалавеку плявалі ў твар, а тым больш забівалі? Таму вы не хвалюйцеся. Усё будзе нармальна. Мы нічога адзін у аднаго не ўзялі, ні ў каго нічога не ўкралі і шыкоўнага за чужы кошт нічога не стварылі. Там (ва Украіне. — **Заўвага БЕЛТА**) давялі ўжо людзей да такога стану: некаторыя махнулі рукой, думаюць, горш не будзе».

Тэму падзей ва Украіне Аляксандр Лукашэнка закрануў і ў час размовы з дыпламатамі. «Усё будзе нармальна, мы ж славяне», — сказаў ён, звяртаючыся да пасла Украіны ў Беларусі Міхаіла Ежаля.

**Створаная ў Беларусі надзейная сістэма нацыянальнай бяспекі дае магчымасць своечасова рэагаваць на выклікі і пагрозы. Аб гэтым заявіў кіраўнік дзяржавы Аляксандр Лукашэнка, выступаючы 23 лютага на прыёме кіруючага складу Узброеных Сіл і праваахоўных органаў з нагоды Дня абаронцаў Айчыны і Узброеных Сіл Рэспублікі Беларусь, паведамілі БЕЛТА ў прэс-службе беларускага лідара.**

Прэзідэнт падкрэсліў, што гэта свята з'яўляецца адным з самых шануемых у краіне. Яно азначае не толькі даніну глыбокай павагі да нашай гераічнай гісторыі, але і шчырую ўдзячнасць людзям, якія прысвяцілі сваё жыццё абароне Радзімы. Самаадданая воінская праца заўсёды была ў пашане, і таму Дзень абаронцаў Айчыны па праве з'яўляецца ўсенародным.

Як лічыць Аляксандр Лукашэнка, у год 70-годдзя вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў дарэчы падкрэсліць, што ў той свяшчэннай барацьбе з агрэсарам на абарону роднай зямлі ўзняўся ўвесь народ. Безумоўна, асноўны ўдар варожай арміі прынялі на сябе людзі ў пагонах і паказалі прыклад найвышэйшай доблесці і адвагі, стойкасці маральнага духу і самаадданай любові да Радзімы. Савецкая Армія, у радах якой змагаліся сотні тысяч беларусаў, знішчыла фашысцкую арду і прынесла свабоду не толькі Беларусі, але і ўсёй Еўропе.

Прэзідэнт адзначыў, што наш мужны народ, дастойна перажыўшы ўвесь цяжар вайны і акупацыі, застаўся непакораным і даказаў, што жыць у рабстве не будзе. «Гэты запавет пакалення пераможцаў з'яўляецца для нас асноўным і галоўным дэвізам стварэння, абароны і развіцця нашай суверэннай дзяржавы», — сказаў беларускі лідар.

«Я не раз гаварыў і сёння асабліва хачу падкрэсліць, што мы будуем сваю міралюбівую, незалежную дзяржаву для таго, каб народ ніколі не быў пад чыім-небудзь бізуном. У гэтым мая асноўнай мэта як кіраўніка дзяржавы, — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка. — Важным фактарам у яе дасягненні з'яўляюцца добра падрыхтаваныя Узброеныя Сілы, дзеяздольныя праваахоўныя органы, прызначаныя забяспечыць абараназдольнасць краіны і сацыяльна-палітычную стабільнасць у грамадстве».

«Мы жывём у дынамічным, зменлівым свеце. То тут, то там на планеце ўспыхваюць ачагі напружанасці. Таму нам нельга страчваць пільнасць. Вучыцца трэба на памылках іншых і не дапусціць нават самых малых праяў нестабільнасці ў нашай краіне». Прыкладаў таго вялікае мноства, уключаючы незатухальныя «рэвалюцыі» ў мусульманскім свеце і беспарадкі ў краінах Садружнасці, якія перыядычна ўзнікаюць», — адзначыў кіраўнік дзяржавы. На думку Прэзідэнта, у гэтых адносінах паказальная сітуацыя ў суседняй Украіне, якая стала арэнай сутыкнення магутных знешніх і ўнутраных сіл.

«Нават у нашым грамадстве, як я заўважыў, намеціліся нейкія напружанні, апасенні за бяспеку і стабільнасць нашай дзяржавы», — сказаў Прэзідэнт.

«Для нас майдан не тое што непрымальны, — майдана ў Беларусі не будзе. Гэта наш з вамі, людзей у пагонах, свяшчэнны абавязак і задача — захаваць мір і стабільнасць на нашай зямлі», — заявіў кіраўнік дзяржавы.

На думку Аляксандра Лукашэнкі, як бы ні адрозніваліся такія падзеі ў розных краінах, нельга не заўважыць агульныя характэрныя рысы. «Аслабленне ўлады ў дзяржаве, карупцыя, беспакаранасць і бязладнасць, безадказнасць улады, аб чым вельмі часта апошнім часам гаворым, прыводзяць да беспарадку і анархіі. Грамадства раскалваецца, эканоміка стагніруе, людзі церпяць і становяцца сляпой прыладай дэструктыўных сіл. Калі ў нас сваіх не хапае, нам могуць падкінуць, і гэта мы таксама павінны мець на ўвазе. І быццам каршуны на дзяльбу здабычы злятаюцца замежныя «добразычлі ўцы», якія яшчэ больш распальваюць страсці і падкідваюць дровы ў агонь», — адзначыў Аляксандр Лукашэнка.

На думку Прэзідэнта, Беларусь з прычыны свайго геаграфічнага становішча і адкрытасці эканомікі не можа быць абмежавана ад уплыву большасці геапалітычных працэсаў, якія адбываюцца ў свеце. «Таму для нас так важна прадуманая сістэмная знешняя і ўнутраная палітыка, якая дае магчымасць абараняць Беларусь ад негатыўных з'яў, не дапускаць расколу ў грамадстве або анархіі, папярэджваць любыя варожыя намеры», — лічыць Аляксандр Лукашэнка.

Кіраўнік дзяржавы таксама падкрэсліў, што «мы змаглі стварыць надзейную сістэму нацыянальнай бяспекі, якая дае магчымасць своечасова рэагаваць на выклікі, рызыкі і пагрозы».

Паводле слоў Прэзідэнта, «наша важнейшая суверэнная заваёва — тое, што ў няпростых умовах нам удалося зберагчы згоду і спакой нашага народа». У Беларусі на працягу больш як 20 гадоў захоўваюцца мір і стабільнасць. Як лічыць Аляксандр Лукашэнка, гэты факт навейшай гісторыі і галоўная ўмова паспяховага развіцця Беларусі. У многім гэта дасягнута дзякуючы мужнасці, вытрымцы, бескарыслівай працы асабовага складу Узброеных Сіл і праваахоўных органаў.

Кіраўнік дзяржавы падкрэсліў важнасць таго факта, што ў Беларусі здолелі захаваць і развіць абаронны сектар эканомікі, навуковы патэнцыял, якія на самым высокім узроўні забяспечваюць распрацоўку і вытворчасць найноўшых узораў узбраення, якія не ўступаюць па сваіх характарыстыках прадукцыі ваеннага прызначэння вядучых дзяржаў свету.

Аднак, як заўважыў Прэзідэнт, пастаяннае ўдасканаленне, развіццё сістэмы забеспячэння бяспекі — працэс бесперапынны. «Таму наперадзе ва ўсіх нас вельмі напружаная работа», — сказаў Аляксандр Лукашэнка. Ён лічыць, што неабходна сістэмная і самае галоўнае — папераджальная работа па падтрыманні бяспекі дзяржавы. «Мы павінны забяспечыць спакой, парадак і стабільнасць у грамадстве», — падкрэсліў кіраўнік дзяржавы.

Ён выказаў удзячнасць кіраўнікам дзяржаўных органаў сістэмы забеспячэння нацыянальнай бяспекі, усім ваеннаслужачым за добрасумленную працу і павіншаваў усіх са святам.

Па традыцыі Прэзідэнт Беларусі ўручыў генеральскія пагоны прадстаўнікам сілавых структур.

## Уладзімір Співакоў узнагароджаны ордэнам Францыска Скарыны

За значны асабісты ўклад у развіццё і папулярызацыю класічнага мастацтва, вялікія заслугі ва ўмацаванні культурных сувязей паміж Расійскай Федэрацыяй і Рэспублікай Беларусь мастацкі кіраўнік і галоўны дырыжор Дзяржаўнага камернага аркестра «Віртуозы Масквы», прэзідэнт Маскоўскага міжнароднага дома музыкі Уладзімір Співакоў узнагароджаны ордэнам Францыска Скарыны. Адпаведны ўказ Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка падпісаў 24 лютага, паведамілі БЕЛТА ў прэс-службе кіраўніка дзяржавы.

## МЗС: у Беларусі не хаваюцца высокапастаўленыя чыноўнікі Украіны

**У суботу, 22 лютага, на сайце МЗС Беларусі з'явіўся каментарый прэс-сакратара знешнепалітычнага ведамства Дзмітрыя Міронбчыка адносна паведамленняў у асобных сродках масавай інфармацыі аб тым, што на тэрыторыі Беларусі хаваюцца высокапастаўленыя чыноўнікі і палітычныя дзеячы Украіны, і пагроз, якія ў сувязі з гэтым паступаюць на адрас пасольства Беларусі ў Кіеве.**

«...Гэтая інфармацыя не адпавядае рэчаіснасці, — паведаміў Дзмітрый Міронбчык. — Такіх асоб на тэрыторыі Беларусі няма».

Міністэрства замежных спраў разглядае такія інсінуацыі як наўмысную правакацыю, папярэджвае прэс-сакратар. «Выклікаюць таксама абурэнне выпадкі абстрэлаў аўтатранспартнай тэхнікі з рэгістрацыйнымі нумарамі Рэспублікі Беларусь, якія праязджаюць па тэрыторыі Украіны. Гэта цалкам недапушчальна ў еўрапейскай краіне», — сказана ў каментарыі.

Знешнепалітычнае ведамства Беларусі падкрэслівае, што з Украінай нас звязваюць даўнія і цесныя сувязі дружбы і ўзаемаразумення.

«Спробы некаторых сіл убіць клін у сяброўскія беларуска-ўкраінскія адносіны заслугоўваюць рэзкага асуджэння і не будуць успрынятыя народамі нашых краін», — лічыць прадстаўнік МЗС Беларусі.

**Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА.**

## Беларускім ІП могуць дазволіць наймаць работнікаў, якія не з'яўляюцца членамі іх сем'яў

**Аб гэтым паведаміў учора журналістам старшыня Беларускага саюза прадпрымальнікаў Аляксандр Калінін па выніках праведзенай ва ўрадзе сустрэчы прэм'ер-міністра Міхаіла Мясніковіча з прадпрымальнікамі, передае карэспандэнт БЕЛТА.**

«Урад пагадзіўся з прапановай дзелавых саюзаў аб увядзенні наёмных работнікаў для індывідуальных прадпрымальнікаў, — сказаў Аляксандр Калінін. — Дасягнута пагадненне, што ў праекце кампраміснага дакумента будуць тры наёмныя работнікі з моманту ўвядзення ўказа ў дзеянне. Гэта могуць быць любыя тры наёмныя работнікі, не абавязкова сваякі».



■ Погляд

# УКРАІНСКІЯ ПЕРЫПЕТЫІ

**У падзеях ва Украіне ёсць усё, што звычайна бывае ў час масавых хваляванняў і рэвалюцый. І кроў, і бардак, і расправы над чыноўнікамі, і стральба бандытаў у мірных жыхароў і турыстаў, дзеля куражу. Хто б ні арганізаваў тое, што адбываецца ва Украіне (а ў гэтых падзей шмат аўтараў), цяпер цяжка сказаць, што сітуацыя знаходзіцца пад кантролем або лёгка зможа прыйсці ў большменш прыстойны стан. Ёсць у тым, што адбылося, і віна былой улады.**

Калі я некалькі гадоў таму ездзіў адпачываць цягніком у Крым, то маё першае ўражанне, якое дазваляла стварыць уласнае ўяўленне аб стане правапарадку ва Украіне, не было пазітыўным.

Ледзь мы перасеклі беларуска-ўкраінскую мяжу, як адразу следам за афіцэрамі памежнай службы і мытні адзін за адным з невялікім інтэрвалам пайшлі валютчыкі, якія прапаноўвалі пасажырам абмяняць грошы. Ці законны абмен валюты прыватнымі асобамі ў цягніках Украіны? Зразумела, не. Яны не могуць забяспечыць як бяспеку абмену, так і не плацяць падаткі, з-за чаго відавочна церпіць бюджэт. Але чаму памежнікі і мытнікі Украіны мірацца з парушэннем заканадаўства, якое адбываецца навідавоку? Адказ наводзіць на роздумы аб карупцыі ў іх радах.

І карупцыйныя праблемы былі ва Украіне не толькі ў гэтай сферы. Калі спытаць беларускіх кіроўцаў, якія часта ездзяць па дарогах Украіны, то іх абурэнне паборамі з боку ўкраінскага ДАІ проста не перадаць словамі. Відавочна, што, калі такія маштабныя карупцыйныя праявы былі ў гэтых сферах, улада наўрад ці была здольная забяспечыць належны стан правапарадку па ўсёй краіне.

Не справіўшыся з гэтым, яна аказалася няздольнай і абараніць унутранае палітычнае поле краіны ад нахабнага ўмяшання прадстаўнікоў замежных дзяржаў, якія навязваюць прэзідэнту Украіны свае ўласныя інтарэсы пры дапамозе майдана. Ды і не мела ўлада належнага аўтарытэту сярод грамадзян, каб паспяхова ізаляваць радыкалаў на майдане і прывесці грамадскую сітуацыю ў нармальнае рэчышча.

Прэзідэнт Януковіч не ўлічыў, што ўладу трэба не толькі выйграць на выбарах, але і падтрымліваць яе прэстыж у грамадстве, забяспечваючы абарону інтарэсаў насельніцтва на пастаяннай аснове. Не змог ён абараніць і тых, хто яго падтрымліваў. Пастаянная гатоўнасць ісці на кампрамісы з апанентамі за кошт сваіх прыхільнікаў, спадзеючыся на гарантыі бяспекі з боку краін ЕС і ЗША асабіста для сябе, аказалася зусім няправільнай стратэгіяй. Прэзідэнт забыў, што Захад абяцае гарантыі толькі тым, з кім яшчэ не ў сілах саўладаць, і тут жа акліквае іх, атрымліваючы перавагу.

Не даводзіцца здзіўляцца, што ўласная Партыя рэгіёнаў адраклася ад Януковіча, размясціўшы на сваім сайце адпаведны артыкул. У ім гаворыцца наступнае: «Украіне здрадзілі, а людзей сутыкнулі лбамі. Уся адказнасць за гэта ляжыць на Януковічу і яго бліжэйшым акружэнні. Мы, фракцыя Партыі Рэгіёнаў у Вярхоўнай Радзе Украіны і нашы аднапартыйцы, рашуча асуджаем злачынныя загады, якія прывялі да чалавечых ахвяр, да пустой казны, вялізных даўгоў, ганьбы ў вачах украінскага народа і ўсяго свету, у выніку чаго наша краіна апынулася на краі бездані, пагрозы расколу і страты нацыянальнага суверэнітэту. Любыя спробы паўплываць на сітуацыю, пераканаць Прэзідэнта не былі пачуты».

Урокі ўкраінскіх падзей дастаткова простыя. Каб абараніць сябе і грамадзян, любая ўлада павінна падтрымліваць свой аўтарытэт нястомнымі дзеяннямі ў інтарэсах грамадзян. Барацьба з карупцыяй павінна ажыццяўляцца не на паперы, а пры дапамозе рашучых мерапрыемстваў, якія праводзяцца дзень і ноч.

Ні ў якім выпадку нельга мірыцца з радыкаламі. Гадамі ўкраінская ўлада паблажліва глядзела на размешчаныя ў краіне лагеры баевікоў і ўдзел прадстаўнікоў мясцовых радыкальных фарміраванняў у ваенных дзеяннях за мяжой і раптам аказалася агарошаная тым, што ўсё гэта кінулі супраць яе.

**Пастаянная гатоўнасць ісці на кампрамісы з апанентамі за кошт сваіх прыхільнікаў, спадзеючыся на гарантыі бяспекі з боку краін ЕС і ЗША асабіста для сябе, аказалася зусім няправільнай стратэгіяй.**

Нельга мірыцца з тым, што прадстаўнікі замежных дзяржаў фінансуюць вядучыя СМІ і актыўна ўмешваюцца ў фарміраванне пазіцый палітычных партый.

Калі ў краіне існуюць рэгіянальныя расколы, трэба актыўна працаваць над тым, каб яны не ўзмацняліся, і пераадольваліся. Сітуацыя, калі Заходняй Украіне фактычна дазвалялі быць «дзяржавай у дзяржаве», умацоўваючы спецыфічную ідэнтычнасць, у тым ліку з элементамі радыкалізму і нацызму, а Усходняя Украіна заставалася раз'яднанай, дрэнна арганізаванай і ў выніку аказалася няздольнай паклапаціцца аб сваіх інтарэсах, ненармальная.

У беларускіх інтарэсах, каб сітуацыя ва Украіне стабілізавалася як мага хутчэй. Калі Украіна хоча ацалець як дзяржава, неабходна рашуча змагацца з радыкалізмам у дачыненні да іншаэтнічнага насельніцтва, прыструніць бандытаў, якія выкарыстоўваюць распад дзяржаўных інстытутаў у мэтах грабяжу і звядзення асабістых рахункаў, і аднавіць функцыянаванне дзяржаўных органаў.

Акрамя таго, ужо цяпер відавочныя імкненні некаторых выхадцаў з Заходняй Украіны ўвесці ў дачыненні да жыхароў Усходняй Украіны рэжым абмежаванняў іх правоў і законных інтарэсаў. Калі такія парадкі будуць узаконены, гэта стане магутным стымулам для Усходняй Украіны да аб'яднання супраць заходняй часткі краіны і можа прывесці да расколу дзяржавы. Наўрад ці падобны сцэнарый абрадуе хоць адну з суседніх дзяржаў.

**Сяргей КІЗІМА,**
**доктар палітычных навук** ■

НАВІНЫ ПАДЗЕІ ФАКТЫ

## ВАЛЬС З ВОПЛЕСКАМІ І ТОРТ АД ГУБЕРНАТАРА

**У Мінскім абласным кадэцкім вучылішчы адбыўся баль з нагоды Дня абаронцаў Айчыны і Узброеных Сіл Беларусі.**

Юныя кадэты прадэманстравалі сваё майстэрства ў выкананні бальных танцаў. Асаблівым момантам сталі майстар-класы па развучванні вальса з воплескамі і полькі «Ганна». У перапынках паміж танцамі выконвалі любімыя песні, чыталі вершы.

У мерапрыемстве ўзялі ўдзел таксама кадэты з Брэстчыны, Віцебшчыны, Магілёўшчыны, Гродзеншчыны і Мінскіх гарадскіх кадэцкіх вучылішчаў № 1 і № 2, шматлікія госці. Павіншавала будучых абаронцаў Айчыны начальнік упраўлення адукацыі Мінаблвыканкама Галіна Казак. Галіна Мікалаеўна ўручыла ім ганаровы адрас ад імя міністра абароны Беларусі Юрыя Жадобіна.

Праграма прадугледжвала таксама экскурсіі — па ўстанове і ў музей гісторыі слуцкіх паясоў, а таксама пачастунак ад ваенна-палявой кухні. А галоўным сюрпрызам стаў святочны торт ад старшыні Мінскага абласнога выканаўчага камітэта Барыса Шапіры.

**Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ.**

## ЛЁТЧЫК ВЯРНУЎСЯ З ВАЙНЫ

**Амаль 70 гадоў блізкія ваеннага лётчыка малодшага лейтэнанта Сяргея Гараўцова з горацкай вёскі Маслакі, што на Магілёўшчыне, не ведалі, дзе ён загінуў. Гэты прабел выправілі пошукавікі атрада «Подзвіг» з Геленджыка, якія знайшлі месца падзення самалёта і па нумары ўстанавілі імя яго лётчыка.**

Пошукавікі таксама вярнулі з небыцця імёны яшчэ двух беларускіх паветраных асаў — з Лепеля і Мінска. Па ініцыятыве актывістаў міжнароднага патрыятычнага руху «Марское братэрства — непарушнае!» у краіну прывезены капсулы з зямлёй з месцаў пахавання гэтых герояў. Магілёў стаў другім горадам на шляху іх праходжання ў рамках патрыятычнай беларуска-расійскай акцыі «Марскія крылы Айчыны». Падчас правядзення ўрачыстага мерапрыемства на Буйніцкім полі капсула з зямлёй, якая была паліта крывёю Сяргея Гараўцова, была перададзена яго сваякам.

Як адзначыў пры гэтым намеснік старшыні Магілёўскага гарвыканкама Андрэй Кунцэвіч, дзякуючы расійскім пошукавікам пра подзвіг, які здзейснілі ў чарнаморскім небе беларусы, стала вядома ўсім. «Праца, якую робяць пошукавікі, вельмі значная і патрэбная, — падкрэсліў ён. — На тэрыторыі Магілёва знаходзяцца астанкі больш чым 80 тысяч чалавек, што загінулі падчас вайны. Але толькі ў тысячы з іх прозвішчы вядомы».

Дарэчы, памяць лётчыка Сяргея Гараўцова таксама ўшанавалі ў магілёўскім медыцынскім каледжы, дзе ён вучыўся.

**Нэлі ЗІГУЛЯ.**

## ПАДПАЛІЎ… 12 АЎТАМАШЫН

**Раніцай у Фрунзенскі РУУС сталіцы пачалі паступаць паведамленні аб падпалах і пашкоджаннях аўтамашын. З 5 да 6.30 стала вядома пра 12 (!) падобных здарэнняў. Па «гарачых» слядах падазроны ў падпалах быў затрыманы.**

Напачатку на праспекце Пушкіна каля аднаго з дамоў была пашкоджана «Альфа-Рамэа», затым праз два дамы — «ВАЗ-2107», праз чатыры дамы — аналагічная мадэль. На вуліцы Адоеўскага пацярпеў «ВАЗ-2105», затым — ужо «Рэно-19». Яшчэ былі «БМВ-520», «Таёта-Карола» і «Дэу-Маціз». На вуліцы Янкі Маўра былі пашкоджаны аўтамашына «Івека», потым «Нісан-Алмера», за ёй — «Аўдзі-100», «Фальксваген-Гольф».

Па падазрэнні ў падпалах быў затрыманы раней судзімы за крадзяжы 30-гадовы непрацуючы мінчанін, які пражываў на вуліцы Янкі Маўра. У падазронага знайшлі дзве аўтамагнітолы, якія, хутчэй за ўсё, былі ўкрадзены з аўтамашын.

Згодна з папярэдняй версіяй, мужчына дзейнічаў па адной схеме. Ён пранікаў у аўтамабіль шляхам пракручвання сарцавіны замка або разбіўшы шкло. А пасля ўчыняў падпал, выкарыстоўваючы ў тым ліку любую паперу, што была ў салоне, і збягаў. Як паведамілі ў Фрунзенскім РУУС г. Мінска, агульны ўрон, нанесены ўладальнікам аўтамашын, склаў 188 мільёнаў рублёў. За наўмыснае знішчэнне і пашкоджанне маёмасці ў асабліва буйным памеры затрыманаму пагражае пакаранне ў выглядзе пазбаўлення волі на тэрмін ад 7 да 12 гадоў.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

## ХУТКА НЕРАСТ

**Пры з'яўленні талай вады пачынае больш інтэнсіўна рухацца, карміцца і рыхтавацца да штогадовага нерасту рыба. Першай на яго ідзе шчупак: накіроўваецца супраць цячэння па рэках і каналах і, знайшоўшы на мелкаводдзі прагрэтыя месцы, пачынае нерасціцца.**

— Таму варта нагадаць, што, згодна з правіламі вядзення рыбалоўнай гаспадаркі і рыбалоўства, у краіне ўстаноўлена забарона на лоўлю звычайнага шчупака ў перыяд з 1 па 31 сакавіка, — паведаміў «Звяздзе» старшы дзяржаўны інспектар Мінскай абласной інспекцыі Вадзім Варабей.

За здабычу шчупака ў забаронены перыяд правапарушальнікі могуць прыцягвацца да адміністрацыйнай ці крымінальнай адказнасці ў залежнасці ад характару правапарушэння. У прыватнасці, можна атрымаць штраф у памеры ад 10 да 50 базавых велічынь з канфіскацыяй прылад лоўлі рыбы ці іншых водных жывёл і іншых прадметаў, якія сталі прыладай ці сродкам здзяйснення ўказанага правапарушэння.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

## СУРАГАТ ПАД ВІДАМ САМАГОНУ

**У Маладзечне ў адной з кватэр выяўлены факт незаконнага захоўвання тэхнічнага спірту. Маладая жанчына, дарэчы, сацыяльны работнік, разбаўляла яго вадой з-пад крана, дадавала для паху самагон і пад выглядам апошняга кругласутачна прадавала мясцовым жыхарам па 25 тыс. рублёў за паўлітра.**

У дамах па вуліцы Новы Свет і Мядзельскай знішчаны два самагонныя апараты, канфіскавана звыш двух тон брагі і 100 літраў самагону. Маштабы вытворчасці даюць падставу меркаваць, што гарэлка выраблялася для далейшай рэалізацыі на так званых «кропках». На ўсіх вытворцаў састаўлены адпаведныя пратаколы, а матэрыялы накіраваны ў суд.

Акрамя таго, знойдзена пяць самагонных прыстасаванняў, схаваных у лесе. У чатырох з іх выспявала брага. «Тэхніка» дэмантавана, праводзяцца дадатковыя мерапрыемствы па ўстанаўленні яе ўласнікаў.

Паводле звестак аддзялення інфармацыі і грамадскіх сувязяў упраўлення ўнутраных спраў Мінаблвыканкама, гэтыя факты выявілі, дзякуючы пільнасці грамадзян. Нагадаю, у цэнтральным рэгіёне працягваецца сумесная акцыя абласнога УУС і Рэспубліканскага ўнітарнага прадпрыемства «Белпошта» па спыненні незаконнага абарачэння спіртнога. Любы чалавек можа паведаміць у міліцыю пра выпадкі вырабу і рэалізацыі сурагатных ці «левых» алкагольных напояў, апусціўшы ў паштовую скрынку пісьмо з канкрэтным адрасам. Сігналы аператыўна правяраюцца супрацоўнікамі міліцыі. І, як паказвае практыка, у большасці выпадкаў пацвярджаюцца.

**Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ.**


## Извещение о проведении 31 марта 2014 г. торгов по продаже принадлежащих ОАО «МАПИД» машино-мест в здании специализированном автомобильного транспорта (гараж-стоянка), расположенном по адресу: г. Минск, ул. Бельского, д. 28

| № предмета торгов | № машино-места | Площадь, кв.м | Инвентарный номер | № предмета торгов | № машино-места | Площадь, кв.м | Инвентарный номер | № предмета торгов | № машино-места | Площадь, кв.м | Инвентарный номер |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | 1 | 16,3 | 500/D-708104474 | 23 | 47 | 18,9 | 500/D-708104496 | 45 | 75 | 19,0 | 500/D-708104517 |
| 2 | 3 | 16,3 | 500/D-708104475 | 24 | 49 | 18,9 | 500/D-708104497 | 46 | 76 | 18,5 | 500/D-708104518 |
| 3 | 6 | 15,0 | 500/D-708104476 | 25 | 50 | 17,6 | 500/D-708104498 | 47 | 78 | 18,7 | 500/D-708104519 |
| 4 | 8 | 15,8 | 500/D-708104477 | 26 | 51 | 14,0 | 500/D-708104499 | 48 | 79 | 18,9 | 500/D-708104520 |
| 5 | 9 | 16,4 | 500/D-708104478 | 27 | 52 | 16,6 | 500/D-708104500 | 49 | 80 | 18,5 | 500/D-708104521 |
| 6 | 11 | 16,4 | 500/D-708104479 | 28 | 53 | 16,6 | 500/D-708104501 | 50 | 82 | 18,5 | 500/D-708104522 |
| 7 | 15 | 16,4 | 500/D-708104480 | 29 | 54 | 16,4 | 500/D-708104502 | 51 | 83 | 18,8 | 500/D-708104523 |
| 8 | 16 | 13,2 | 500/D-708104481 | 30 | 55 | 16,4 | 500/D-708104503 | 52 | 84 | 18,8 | 500/D-708104524 |
| 9 | 17 | 16,3 | 500/D-708104482 | 31 | 56 | 16,4 | 500/D-708104504 | 53 | 85 | 19,7 | 500/D-708104525 |
| 10 | 18 | 17,2 | 500/D-708104483 | 32 | 57 | 16,6 | 500/D-708104505 | 54 | 86 | 16,9 | 500/D-708104526 |
| 11 | 19 | 16,1 | 500/D-708104484 | 33 | 58 | 16,6 | 500/D-708104506 | 55 | 87 | 19,2 | 500/D-708104527 |
| 12 | 20 | 16,5 | 500/D-708104485 | 34 | 59 | 16,7 | 500/D-708104507 | 56 | 88 | 18,9 | 500/D-708104528 |
| 13 | 21 | 19,9 | 500/D-708104486 | 35 | 61 | 16,5 | 500/D-708104508 | 57 | 89 | 19,2 | 500/D-708104529 |
| 14 | 22 | 16,6 | 500/D-708104487 | 36 | 62 | 16,5 | 500/D-708104509 | 58 | 90 | 18,9 | 500/D-708104530 |
| 15 | 32 | 19,2 | 500/D-708104488 | 37 | 64 | 19,7 | 500/D-708104510 | 59 | 91 | 19,2 | 500/D-708104531 |
| 16 | 35 | 18,7 | 500/D-708104489 | 38 | 65 | 16,6 | 500/D-708104511 | 60 | 92 | 18,7 | 500/D-708104532 |
| 17 | 36 | 17,5 | 500/D-708104490 | 39 | 67 | 16,4 | 500/D-708125805 | 61 | 93 | 19,4 | 500/D-708104533 |
| 18 | 37 | 18,9 | 500/D-708104491 | 40 | 68 | 16,6 | 500/D-708104512 | 62 | 94 | 18,8 | 500/D-708104534 |
| 19 | 38 | 19,0 | 500/D-708104492 | 41 | 69 | 21,2 | 500/D-708104513 | 63 | 95 | 19,3 | 500/D-708104535 |
| 20 | 41 | 18,2 | 500/D-708104493 | 42 | 70 | 18,1 | 500/D-708104514 | 64 | 96 | 18,8 | 500/D-708104536 |
| 21 | 43 | 14,7 | 500/D-708104494 | 43 | 71 | 16,4 | 500/D-708104515 | 65 | 97 | 19,1 | 500/D-708104537 |
| 22 | 44 | 19,0 | 500/D-708104495 | 44 | 72 | 14,7 | 500/D-708104516 | 66 | 98 | 18,7 | 500/D-708104538 |
| | | | | | | | | 67 | 99 | 20,3 | 500/D-708104539 |
| | | | | | | | | 68 | 100 | 16,8 | 500/D-708104540 |

**Начальная цена предмета торгов (каждого машино-места) составляет 114 815 000 рублей с учетом НДС.**

**Задаток по каждому предмету торгов (одно машино-место) составляет 11 400 000 рублей.**

**Организатор торгов:** УП «Минский городской центр недвижимости», г. Минск, ул. К. Маркса, 39, к. 10.

**Продавец (собственник) имущества:** ОАО «МАПИД», г. Минск, ул. Р. Люксембург, 205.

Торги проводятся в соответствии со ст.ст. 417, 418 Гражданского кодекса Республики Беларусь и порядком проведения аукциона по продаже имущества, принадлежащего ОАО «МАПИД», утвержденным организатором торгов.

К участию в торгах допускаются юридические и физические лица, заключившие соглашение с организатором торгов о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона, внесшие задаток (в случае участия в торгах в отношении нескольких предметов торгов – задаток вносится для каждого из предметов торгов), а также представившие организатору торгов следующие документы:

заявление на участие в аукционе (по форме, установленной организатором торгов); заявление об ознакомлении с документами, продаваемым имуществом, порядком проведения аукциона (по форме, установленной организатором торгов); копию свидетельства о регистрации (для юридических лиц и индивидуальных предпринимателей); копию устава (для юридических лиц); копию платежного документа о внесении задатка; документы, подтверждающие полномочия представителя юридического (физического) лица; а также, при необходимости, иные документы в соответствии с порядком проведения аукциона.

Задаток для участия в аукционе в сумме 11 400 000 рублей (для каждого предмета торгов) перечисляется на расчетный счет УП «Минский городской центр недвижимости» № 3012104971019 в региональной дирекции № 700 ОАО «БПС-Сбербанк», г. Минск, код 153001369, УНП 190398583, в срок, установленный для приема документов на участие в аукционе.

Торги проходят в форме открытого аукциона на повышение начальной цены. Торги проводит аукционист, определенный организатором торгов. В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем торгов, а наивысшая цена (цена продажи) фиксируется в протоколе о результатах торгов. В ходе торгов участники могут предлагать свою цену за продаваемое имущество в соответствии с порядком проведения аукциона.

Оплата стоимости приобретенного имущества осуществляется победителем торгов (покупателем) в течение 30 календарных дней со дня проведения аукциона и подписания протокола о его результатах на расчетный счет продавца.

Договор купли-продажи между продавцом и победителем торгов (покупателем) заключается в течение 10 рабочих дней со дня внесения полной оплаты стоимости имущества и возмещения организатору аукциона затрат на организацию и проведение аукциона.

Победитель торгов (покупатель) в течение 3 рабочих дней со дня проведения аукциона обязан возместить организатору аукциона затраты на его организацию и проведение.

Торги проводятся **31 марта 2014 года в 15.00** по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов. Прием документов, а также консультации по вопросам участия в торгах осуществляются **с 26.02.2014 по 27.03.2014 включительно** в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 (по пятницам – до 16.45) по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 6.

**Телефоны для справок: (017)327-48-36 (УП «Минский городской центр недвижимости»).**



**Наблюдательный совет открытого акционерного общество «Дорожно-строительный трест № 2, г. Гомель» сообщает о проведении годового собрания акционеров, которое состоится 28 марта 2014 года в зале заседаний ДСУ-17 по адресу: г. Гомель, Инженерный переулок, д. 6.**

**ПОВЕСТКА ДНЯ:**

1. Отчет генерального директора о финансово-хозяйственной деятельности ОАО «ДСТ № 2, г. Гомель» и выполнении прогнозных показателей за 2013 год, принятие параметров прогноза социально-экономического развития ОАО «ДСТ № 2, г. Гомель» на 2014 год.
2. Отчет ревизионной комиссии по результатам годовой проверки и аудиторского заключения деятельности ОАО «ДСТ № 2, г. Гомель» и Наблюдательного Совета о проделанной работе в 2013 году.
3. Утверждение годового отчета за 2013 год, бухгалтерского баланса, отчета о прибылях и убытках.
4. Утверждение распределения чистой прибыли по итогам 2013 года и направлений ее использования в 2014 году, размера и сроков выплаты дивидендов за 2013 год. Выплата дивидендов в 2014 году.
5. Избрание членов Наблюдательного Совета.
6. Избрание членов ревизионной комиссии.
7. Определение условий материального вознаграждения членам Наблюдательного Совета и ревизионной комиссии.
8. О внесении изменений и дополнений в Устав Общества и принятие его в новой редакции.

**Регистрация участников собрания с 10.00. Начало собрания в 11.00.**

**Дата составления списка акционеров, имеющих право на участие в собрании, — 25 февраля 2014 г.**

**С собой иметь документ, удостоверяющий личность акционера, представителям — доверенности.**

УНП 400022426



# НАША НАЙЛЕПШАЯ АЛІМПІЯДА

## Спецыяльны карэспандэнт «Звязды» Анатоль Сланеўскі расказвае пра апошні дзень XXII зімовых Гульняў

**...Апошнім з відаў спаборніцтваў на XXII зімовай Алімпіядзе быў, вядома ж, хакей. Фінал. Канада — Швецыя — 3:0. «Кляновыя лісты» сталі 9-разовымі алімпійскімі чэмпіёнамі.**
**А найлепшых вынікаў у Сочы дасягнулі гаспадары: расійскія спартсмены заваявалі 13 залатых, 11 сярэбраных і 9 бронзавых медалёў, узначаліўшы агульны медальны залік Алімпіяды. Другое месца заняла зборная Нарвегіі (11-5-10). Трэцяй стала Канада (10-10-5). Зборная Беларусі правяла найлепшыя зімовыя Алімпійскія гульні ў сваёй гісторыі, выйграўшы 5 залатых медалёў і 1 бронзавы. Гэта дазволіла нашай камандзе размясціцца на 8-м месцы, апярэдзіўшы ў ліку іншых такія моцныя зборныя, як Аўстрыі, Францыі, Кітая і Швецыі...**

50-кіламетровым марафонам завяршылася лыжная праграма Алімпіяды ў Сочы. Увесь п'едэстал гонкі занялі расіяне.

Выдатную гонку правялі і беларускія лыжнікі: 40-гадовы Сяргей Далідовіч прайшоў усе прасейванні пелатона, пакуль у лідзіруючай групе не засталося толькі 8 наймацнейшых: трое расіян, трое шведаў, нарвежац Сундбю і беларус. Для Сяргея гэтая Алімпіяда стала шостай па ліку: ён дэбютаваў 20 гадоў таму на Гульнях у Ліхамеры — першай беларускай «суверэннай» Алімпіядзе.

На апошнім уздыме беларус абышоў усіх шведскіх лыжнікаў і заняў высокае пятае месца, якое стала для яго найлепшым алімпійскім выступленнем у кар'еры.

Далідовічу часта не шанцавала: не раз на апошніх кіламетрах іншыя лыжнікі і трэнеры быццам незнарок ламалі яму інвентар — лыжы, палкі, што пазбаўляла беларуса шанцаў на высокія месцы. І вось, нарэшце, поспех. Сяргея можна смела ставіць у адзін рад з нашымі медалістамі. У свае 40 такі вынік — выдатнае завяршэнне доўгай кар'еры. Шкада, вядома, што не медаль, але расіяне ў нядзелю сапраўды былі самымі моцнымі.

У маі ўраджэнцу Оршы стукне 41. У нашай алімпійскай зборнай старэй за яго нікога няма. За плячыма — сотні стартаў у кубкавых спаборніцтвах, дзясятак чэмпіянатаў свету. Здараліся і перамогі, хоць у Кубку свету за доўгую кар'еру толькі двойчы ўздымаўся на п'едэстал. У 2001-м заваяваў сваё адзінае «золата». Прычым тады Далідовіч выйграў першы ў гісторыі лыжнага спорту марафон з масавага старту. Сярод сваіх у Далідовіча няма канкурэнтаў ўжо гадоў 15. Разам з ім (а калі на трасе, то можна сказаць «супраць яго») на лыжню выходзяць маладыя хлопцы, але дацягнуцца да ветэрана ніхто не можа. Сяргей — спецыяліст стаерскіх дыстанцый. Прабегчы «пяцідзясятку» для яго гэта — раз плюнуць. Колькі ў яго марафонаў за плячыма? Напэўна, і сам не злічыць. На Алімпійскіх гульнях Далідовічу часам адкрыта не шанцавала. У 2006-м Сяргей падыходзіў да Турына ў выдатнай форме. Аднак злы жарт выкінуў яго ўласны арганізм. У лыжніка ёсць не тое што праблема, але асаблівасць: хранічна павышаны ўзровень гемаглабіну. На высакагор'і Праджэлата гэты самы ўзровень узляцеў яшчэ вышэй. Медыцынская камісія FIS адхіліла спартсмена ад удзелу ў гонцы. Ён прыехаў назад у Мінск, каб працягнуць трэніроўкі на меншай вышыні. Аднак у яго зноў узялі аналізы: яго паказчыкі ўсё яшчэ былі занадта высокія. Таму Сяргею прызначылі яшчэ адну пяцідзённую забарону на ўдзел. Для таго, каб знізіць узровень гемаглабіну да дапушчальнай адзнакі, Далідовіч нават абліваўся вадой. Яму дазволілі ўдзельнічаць толькі ў мас-старце 50 км у апошні дзень спаборніцтваў. Але аўстрыйскі трэнер, які раптоўна выскачыў на трасу, справакаваў сутыкненне і пазбавіў беларуса надзей на медаль. Праўда, самы лепшы лыжнік Беларусі даказаў, што ён здольны на многае: у выніку — 12-е месца.

Нягледзячы на ўсе намаганні, не атрымалася ў Турыне стартаваць і ў камандным спрынце. У 2010-м няўдачы працягнуліся. Пасля Гульняў Далідовіч нават заяўляў, што ў Ванкуверы гэтыя алімпійскія гонкі будуць для яго апошнімі. Тады спартсмен затаіў глыбокую крыўду. У першую чаргу, на сябе і на лёс. У паўфінале каманднага спрынту партнёр Далідовіча Леанід Карняенка імчаў да фінішу першым, але пераблытаў паварот і прайграў усё што можна. Крыўда была настолькі вялікай, што ветэран нават хацеў адмовіцца ад удзелу ў фінальным забегу. Тым не менш Сяргей на старт выйшаў. І ішоў у нязвыклай класічнай гонцы на нядрэннай пазіцыі. Па прыездзе на піт-стоп, дзе адбываецца змена лыж, Далідовіч на сваім дыванку інвентару не знайшоў: яго проста забыліся пакласці! Прыйшлося да фінішу ехаць у стартавым камплекце. Праз адну дробязь уся праца пайшла прахам. Але Далідовіч нікога вінаваціць не стаў і проста па-філасофску падсумаваў: «Не мой гэта, напэўна, турнір — Алімпіяда».

Ужо праз год на халменколенскім чэмпіянаце свету беларус ледзь не «заехаў» на п'едэстал. Увесь дуатлон Далідовіч правёў у галаве пелетона і фінішаваў чацвёртым, прайграўшы пераможцу, Петэру Нортугу 2,6 секунды, а бронзаваму прызёру, Ільі Чарнавусаву — усяго 1,4. Сяргей рыхтаваўся да гэтага чэмпіянату як да апошняга бою. І таму няцяжка здагадацца, што ён адчуваў, калі за пару сотняў метраў да фінішу сапернік падбіў лыжу нашага спартсмена і прымусіў яго закапацца носам у снег. Бывай, мара аб медалі... Напэўна, нічога больш крыўднага быць не можа — саступіць секунду ў барацьбе за п'едэстал чэмпіянату свету на чацвёртым дзясятку.

Лыжныя гонкі ў нас ніколі не былі асаблівым прыярытэтам. Біятлон і фрыстайл сваімі медальнымі дасягненнямі пастаянна адносілі чыстых лыжнікаў на другарадныя ролі. Тым не менш, Далідовіч заставаўся ў страі і станавіўся на лыжню, нягледзячы ні на што. Раней зборная Беларусі на кубкавыя спаборніцтвы ездзіла на аўтобусе. Сяргей проста прызнае гэты факт і не скардзіцца на жыццё. Не хапала грошай, не было змазкі — Далідовіч мірыўся і з такімі ўмовамі. Напэўна, нехта іншы ўжо сабраў бы манаткі і рвануў бы па лепшае жыццё ў якую-небудзь суседнюю краіну. «Камусьці мільёна мала, а камусьці і дзесяць рублёў хапае для шчасця», — так па-філасофску лічыць мудры лыжнік.

Кароткае інтэрв'ю пасля гонкі:

***— Сяргей, што можаце сказаць пра сённяшнюю гонку? Якія ўражанні?***

— Я выходзіў на лыжню з настроем «не адстаць і заваяваць які-небудзь медаль». У гэтым, думаю, стратэгічны пралік. А трэба было толькі на «золата» настройвацца. Вырывацца наперад — і ўсе справы. Фізічна я быў гатовы. Не адважыўся на большае, і ў выніку няма ніякага медаля.

***— А што засталося? Спусташэнне, прыкрасць, жаданне ўзяць рэванш?***

— Разуменне таго, што я ў свае 40 па-ранейшаму ў эліце і магу бегчы вельмі хутка. Яшчэ б псіхалогія пераможцы не перашкодзіла, вядома. Каб на спаборніцтвах выходзіць з адзінай мэтай — выйграць. Але такая псіхалогія, напэўна, выхоўваецца толькі перамогамі, а перамога ў мяне толькі адна была — на Кубку свету, ды і тая — у 2001 годзе.

***— Пару гадоў таму ў каманду вярнуўся экс-біятланіст Міхаіл Сямёнаў. З ім цяпер звязваюць усе нашы надзеі?***

— Сямнаццатае месца ў сённяшняй гонцы — вельмі высокі вынік. Будзе належным чынам працаваць, будуць і перамогі. Галоўнае, каб верыў у свае сілы. Можа, яму пашанцуе больш, чым мне...



Фота БЕЛТА.



Фота БЕЛТА.

**Пасля, у 20.14 па маскоўскім часе, пачалася цырымонія закрыцця Алімпіяды, якую, вы, вядома ж, бачылі.**
**І ўсё на гэтым.**
**Чарговыя зімовыя Гульні пройдуць праз чатыры гады на другім краі свету, у паўднёвакарэйскім Пхёнчхане.**
**Як зменіцца вялікі спорт і сам свет за гэты час?**

## СОЧЫ — 2014




**У АГУЛЬНАКАМАНДНЫМ МЕДАЛЬНЫМ ЗАЛІКУ БЕЛАРУСЬ ЗАНЯЛА 8-Е МЕСЦА І АПЯРЭДЗІЛА МНОГІХ СУСВЕТНЫХ СПАРТЫЎНЫХ ГРАНДАЎ:**

| | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|
| 1 | Расія | 13 | 11 | 9 | 33 |
| 2 | Нарвегія | 11 | 5 | 10 | 26 |
| 3 | Канада | 10 | 10 | 5 | 25 |
| 4 | ЗША | 9 | 7 | 12 | 28 |
| 5 | Нідэрланды | 8 | 7 | 9 | 24 |
| 6 | Германія | 8 | 6 | 5 | 19 |
| 7 | Швейцарыя | 6 | 3 | 2 | 11 |
| **8** | **Беларусь** | **5** | **0** | **1** | **6** |
| 9 | Аўстрыя | 4 | 8 | 5 | 17 |
| 10 | Францыя | 4 | 4 | 7 | 15 |
| 11 | Польшча | 4 | 1 | 1 | 6 |
| 12 | Кітай | 3 | 4 | 2 | 9 |
| 13 | Рэспубліка Карэя | 3 | 3 | 2 | 9 |
| 14 | Швецыя | 2 | 7 | 6 | 15 |
| 15 | Чэхія | 2 | 4 | 2 | 8 |

Крыніца: НАК Беларусі. © Інфаграфіка БЕЛТА

# РЭХА ПЕРАМОГ



**Васіль ЖАРАНКОЎ, дырэктар Гомельскага вучылішча алімпійскага рэзерву:**

— Безумоўна, немагчыма не ганарыцца, што выхаванка нашага вучылішча стала алімпійскай чэмпіёнкай. Гэтая перамога — высокая планка для маленькіх фрыстайлістаў, якія толькі-толькі робяць свае першыя крокі ў вялікім спорце. Бо менавіта падобныя выступленні вучаць юных атлетаў давяраць свайму трэнеру і ўстанове, дзе яны займаюцца. Нягледзячы на тое, што лыжная акрабатыка ў Беларусі досыць папулярны від спорту, дзяцей у фрыстайл аддаюць не вельмі ахвотна, бо гэта ўсё ж такі экстрэмальны від спорту. Так што перамога Алы важная яшчэ і з пункту гледжання фарміравання даверу бацькоў да лыжнай акрабатыкі. Асобна хачу падкрэсліць, што мы перажывалі і за яшчэ аднаго прадстаўніка Гомельшчыны ў Сочы — Максіма Осіпава. Гэта таксама наш выхаванец, пра якога мы заўжды памятаем і за поспехамі якога з задавальненнем назіраем.

Калісьці фрыстайл для Беларусі быў экзотыкай. Гэты від спорту фактычна ўзрос на спартыўнай гімнастыцы і скачках у ваду. А ў Гомелі, як вядома, адна з мацнейшых школ спартыўнай гімнастыкі. Таму тут былі створаны ўсе неабходныя ўмовы для развіцця лыжнай акрабатыкі. У канцы 1990-х трэнер Наталля Шарстнёва прывезла з украінскага Роўна ў Гомель групу дзяцей. Сярод іх і была Ала Цупер, талент якой быў відавочны адразу. Але тут яшчэ спрацаваў і талент настаўніка. Кожны трэнер марыць выхаваць алімпійскага чэмпіёна, але атрымліваецца не ва ўсіх. Не дзіўна, што ў такога мэтанакіраванага чалавека, як Наталля Аляксееўна, усё атрымалася.

Дарэчы, ёй мы і даверым распарадзіцца сродкамі, якія паступяць на рахунак вучылішча па праграме «Алімпійскі выбар». Вельмі прыемна, што Ала памятае, дзе пачынала свой шлях у беларускім фрыстайле, і вырашыла дапамагчы сваёй альма-матар. Упэўнены, што «алімпійская дапамога» Алы пойдзе на карысць нашаму аддзяленню фрыстайла і поспехі будучых алімпійцаў не прымусяць сябе доўга чакаць.



**Аляксандр ГАРДЗЕЦКІ, намеснік начальніка аддзела адукацыі, спорту і турызму Сенненскага раённага выканаўчага камітэта:**

— У нашым невялічкім райцэнтры біятлон з'яўляецца самым папулярным відам спорту. Ледзь не кожны школьнік займаўся ці займаецца ў біятлонным аддзяленні спецыялізаванай дзіцяча-юнацкай школы алімпійскага рэзерву. За нашых страляючых лыжнікаў у раёне «хварэлі» ўсе — і моладзь, і пенсіянеры. Пасля чарговай перамогі Домрачавай Фёдар Суша, жыхар вёскі Баравікі, прысвяціў Дар'і рыфмаваныя радкі! Між іншым, яе рашэнне пералічыць на рахунак нашай спартыўнай школы 100 мільёнаў рублёў стала для нас прыемнай нечаканасцю. І ўжо вырашана, што гэтыя сродкі пойдуць на набыццё вінтовак, лыж, змазкі і іншага якаснага інвентару для біятланістаў. Дарэчы, Даша Сянно, родны горад трохразовага чэмпіёна свету па біятлоне Пятра Івашкі, яшчэ ніколі не наведвала. Мы заўжды з радасцю гатовы прыняць у сябе Домрачаву.



**Наталля ШАРСТНЁВА, трэнер Гомельскага вучылішча алімпійскага рэзерву па фрыстайле (першы трэнер Алы Цупер у Беларусі):**

— Той, хто скача ў фінале першым, павінен сканцэнтравацца і пастарацца зрабіць усё так, як ён умее. Ала выйшла на трамплін першай, і ў яе ўсё атрымалася. Магчыма, менавіта ўпэўнены, складаны скачок Цупер з высокім каэфіцыентам цяжкасці паўплываў на яе саперніц і перашкодзіў ім засяродзіцца. Амаль усе спартсменкі пасля Алы падалі. Гэта ўжо псіхалогія. Пасля перамогі да Алы і Мікалая Іванавіча Казекі, галоўнага трэнера зборнай, дазваніцца было нерэальна. Павіншавала іх SMS-паведамленнямі, а пасля пагутарыла з Алай у інтэрнэце.

Як будуць выкарыстаны грошы, якія Ала Цупер пералічыць школе? У гэтым пытанні я вельмі эканомная. Калі дачакаемся сезонных зніжак, купім адпаведны інвентар. Таксама планую вывезці нашых спартсменаў на трэніровачныя зборы па скачках на лыжах на ваду. Для падрыхтоўкі юніёраў нам прыходзіцца выкарыстоўваць трамплін за мяжой — у Чэхіі.

**Дарына ЗАПОЛЬСКАЯ, Тарас ШЧЫРЫ.**

■ Табе, абітурыент

# 3 МЕСЦА — У КАР'ЕРУ

**З 26 па 28 лютага ў сталічным Палацы мастацтваў (вул. Казлова, 3) пройдзе XII спецыялізаваная выстава «Адукацыя і кар'ера».**

Наведванне выставы — найлепшая магчымасць для маладых людзей вызначыцца з прафесійным выбарам, паколькі ніводзін даведнік ці сайт у інтэрнэце не заменіць жывых стасункаў з прадстаўнікамі навучальных устаноў. Да таго ж даволі часта на стэндах працуюць маладыя спецыялісты, якія самі не так даўно пакінулі студэнцкія аўдыторыі, і гэтая акалічнасць знімае ўсе бар'еры ў зносінах. А работнікі прыёмных камісій, у сваю чаргу, раскажуць абітурыентам пра ўсе нюансы падачы дакументаў, залічэння і льгот

У выставе возьмуць удзел беларускія ВНУ, універсітэты з блізкага і далёкага замежжа, установы сярэдняй спецыяльнай і прафесійна-тэхнічнай адукацыі, установы дадатковага выхавання і навучання, рэдакцыі інтэрнэт-парталаў, выдавецтвы — усяго 140 удзельнікаў. Упершыню выставу наведаюць прадстаўнічыя дэлегацыі на чале з кіраўнікамі сістэм адукацыі з Масквы і Кіева.

Маштабным блокам будзе прадстаўлена экспазіцыя Міністэрства адукацыі і навукі Расійскай Федэрацыі. Прадстаўнікі кансультацыйных агенцтваў па адукацыйных праграмах за мяжой пазнаёмяць з праграмамі навучання ў еўрапейскіх краінах. Да таго ж госці выставы змогуць падабраць сабе праграму абмену студэнтамі ці, напрыклад, курсы па вывучэнні замежных моў. Тут жа можна будзе даведацца пра магчымасць здачы міжнародных іспытаў IELTS, TOEFL, DALF і TestDaF.

А выпускнікоў ВНУ і маладых спецыялістаў, якія задумваюцца аб атрыманні паслядыпломнай адукацыі ці набыцці дадатковых кваліфікацый, пракансультуюць вучэбны цэнтр IBA, Інстытут бізнесу і менеджменту тэхналогій БДУ і Інстытут бесперапыннай адукацыі БДУ.

Летась за тры дні работы выставы яе наведалі 10 тысяч чалавек. Не меншая колькасць гасцей чакаецца і сёлета...

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

# ПРЭЗЕНТАЦЫЯ ДЛЯ БУДУЧЫХ АБАРОНЦАЎ

**На сустрэчу з прадстаўнікамі ваенных навучальных устаноў і ваенных факультэтаў краіны сабраліся навучэнцы кадэцкіх класаў і вучні старэйшых класаў Брэста. Ім падрабязна расказалі пра навучальныя ўстановы, у якіх можна атрымаць вайсковую прафесію.**

Так, пра Ваенную акадэмію гледачы даведаліся даволі падрабязна. У фільме былі паказаны асаблівасці кожнага з факультэтаў. З экрана з патэнцыяльнымі абітурыентамі гаварылі курсанты, а таксама начальнік акадэміі Сяргей Бобрыкаў, выкладчыкі і кадравыя вайскоўцы.

Пазнаёміўшыся з тым, якія прафесіі можна атрымаць ў акадэміі, вучні пачулі аб правілах прыёму, патрабаванні ў плане здароўя і маральна-дзелавых якасцяў. Удзельнікі імпрэзы змаглі пазнаёміцца і з сённяшнімі курсантамі ваенных навучальных устаноў. Апошнія паказалі невялікі канцэрт самадзейнасці, а таксама прадэманстравалі навыкі фізічнай і баявой падрыхтоўкі. З вялікай цікавасцю вучні выпускных класаў разглядалі выставу зброі.

**Святлана ЯСКЕВІЧ**

# ФОРМА І СЭНС

***(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)***

Спачатку адабралі 12 лепшых навучэнцаў БДУ — усе яны ўдзельнікі і лаўрэаты конкурсу «Студэнт года БДУ — 2013». Затым моладзь адправілася фатаграфавацца на кінастудыю «Беларусьфільм», дзе ёсць вялікі выбар ваеннай формы і зброі часоў Вялікай Айчыннай вайны. Студэнт 5 курса механіка-матэматычнага факультэта Філіп Хайцін — «твар» лютага, кажа: «Летась я стаў лаўрэатам конкурсу «Студэнт года», а ўжо ў студзені мяне запрасілі паўдзельнічаць у стварэнні календара. Вядома, я не адмовіўся — гэта гонар для кожнага студэнта. Мой месяц, люты, самы халодны, таму пераапрануўся ў зімовы кажух, а ў рукі ўзяў кулямёт». Рэквізіты і адмысловы антураж далі магчымасць маладым людзям адчуць атмасферу няпростай эпохі. Фонам для пераапранутых у форму студэнтаў паслужылі фотаздымкі будынкаў Мінска і вучэбных карпусоў БДУ даваеннага і ваеннага часу. Дарэчы, будынак рэктарата БДУ — адзіны, які не быў разбураны падчас вайны.

Але проста папазіраваць у салдацкай форме мала: кожны студэнт на старонках календара сцісла выказаў сваё стаўленне да Перамогі. «Праўда, што нашы прадзеды аддалі жыццё за тое, каб мы ніколі не сустрэлі вайну: з яе крывавых баёў яны прынеслі новае разуменне жыцця — любоў да яго», — гэта словы студэнта Інстытута журналістыкі Дзмітрыя Нікановіча.

Рэтракаляндар быў надрукаваны ў выдавецкім цэнтры БДУ накладам у тысячу асобнікаў. Па словах Міхаіла Жураўкова, календары яшчэ неаднойчы будуць дадрукоўвацца. Пакуль памятны падарунак атрымліваюць калегі, госці, сябры ўніверсітэта і, безумоўна, — ветэраны Вялікай Айчыннай, былыя педагогі БДУ.

Леанід Цегін, ветэран Узброеных Сіл, адпрацаваў у вучэбнай лабараторыі БДУ 37 гадоў. «Пасля сваёй трыццацігадовай службы ва Узброеных Сілах скажу адкрыта: аддаў вялікую частку свайго жыцця БДУ і ўдзячны за клопат і добрае стаўленне, — кажа ўдзельнік вайны. — Па календары відаць, што ён зроблены з душой. Гэты сувенір сведчыць пра тое, што ў нашым універсітэце вялікая ўвага надаецца выхаванню патрыятызму ў моладзі. Юнакі і дзяўчаты не забываюць пра мінулае — значыць, любяць сваю Радзіму».

Міхаіл Жураўкоў запэўніў, што рэтракаляндар — гэта толькі першы нефармальны падарунак універсітэта да 70-годдзя вызвалення Беларусі. На працягу года ў БДУ плануецца правесці больш за 70 разнапланавых мерапрыемстваў, прымеркаваных да гэтай даты.

**Кацярына РАДЗЮК.**



Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

# АЎТО ПА ДАВЕРАНАСЦІ: ВЫГАДА ЦІ ПРАБЛЕМЫ?

***(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)***

Апошнім часам гэта адбываецца вельмі часта. Людзі, якія прадалі аўтамабіль па генеральнай даверанасці, атрымліваюць адміністрацыйныя пратаколы са штрафнымі санкцыямі, пасля чаго скардзяцца ў падраздзяленні ДАІ, органы пракуратуры, суды. Маўляў, магу даказаць, што ў той час, калі было здзейснена гэтае парушэнне, знаходзіўся зусім у іншым месцы — на рабоце, у бальніцы ці нават за мяжой. А хто быў за рулём — не ведаю, бо машыну даўно прадаў па даверанасці. Аднак такія аргументы дапамагаюць рэдка, хіба што калі ўласнік аўтамабіля сам прыводзіць парушальніка ў Дзяржаўтаінспекцыю.

***— Атрымліваецца, што новы ўладальнік аўтамабіля, які атрымаў транспартны сродак па даверанасці, нават не адказвае за свае парушэнні...***

— З сур'ёзнымі непрыемнасцямі пры такіх здзелках можа сутыкнуцца і пакупнік. Вось прыклад. Аляксандр прадаў Арцёму аўтамабіль маркі «BMW 520і». Быццам і зручна: пры афармленні даверанасці не спатрэбіўся тэхнічны агляд у ДАІ. Праблемы ўзніклі потым, калі Арцём хацеў зняць машыну з уліку. Аказалася, што сапраўдны ідэнтыфікацыйны нумар выразаны, а прывараны іншы, які значыцца па дакументах. Завялі крымінальную справу і Аляксандра прызналі вінаватым у падробцы і знішчэнні нумара кузава ў мэтах збыту транспартнага сродку, аштрафавалі на 26 мільёнаў рублёў. Аднак гэта не палегчыла становішча пакупніка гэтага аўтамабіля, бо ён канфіскаваны ў даход дзяржавы.

Безумоўна, у пацярпелага ёсць права дабівацца праз суд спагнання з нядобрасумленнага прадаўца фактычнай сумы, якую той атрымаў пры падобнай здзелцы. Але даказаць гэта і вярнуць грошы ў такіх выпадках зусім не проста. Прадавец можа заявіць, што грошай не браў, а аддаў сваю машыну ў часовае карыстанне, пакатацца...

Такім чынам, і для прадаўца, і для пакупніка такія здзелкі могуць прывесці да непрыемнасцяў.

**Барыс ПРАКОПЧЫК.**

**ДАВЕДКА «ЗВЯЗДЫ»**

*Генеральная даверанасць на права кіравання і карыстання аўтамабілем рэгламентуецца артыкулам 186 Грамадзянскага кодэкса Рэспублікі Беларусь. Даверанасцю прызнаецца пісьмовае ўпаўнаважанне, якое выдаецца адной асобай другой асобе — для прадстаўніцтва перад трэцімі асобамі (праходжанне тэхагляду транспартнага сродку, страхаванне, рэгістрацыя ў органах Дзяржаўтаінспекцыі). Генеральная даверанасць выдаецца на тэрмін да трох гадоў. Пры гэтым яна не з'яўляецца пацвярджэннем здзелкі куплі-продажу аўтамабіля.*

# Запалка ля бензабака

**У Пухавіцкім раёне падлетак атрымаў апёкі, калі паднёс запалку да бензабака.**

Згодна з папярэдняй версіяй, 13-гадовы падлетак, жыхар пасёлка Праўдзінскі, гуляў са сваім аднакласнікам у двары. Прыяцелі вырашылі праверыць наяўнасць бензіну ў кінутым аўтамабілі «ВАЗ». Дзеля гэтага яны не прыдумалі нічога лепшага, як паднесці агонь да гарлавіны бензабака. У выніку ўспышкі пароў паліва дзіця атрымала тэрмічны апёк полымем твару і валасянога покрыва галавы.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

■ Без бар'ераў

# «МОЙ ДОМ — МАЯ ТУРМА»

## Калі жыллё становіцца непрыступнай крэпасцю для інвалідаў

**«Часта чалавеку для таго, каб выбрацца са сваёй кватэры і пачаць самастойны лад жыцця, неабходна пераадолець свой пад'езд. Нават калі ён абсталяваны ліфтам, не заўжды магчыма выбрацца з яго. Пасля ліфта пачынаюцца гэтыя злашчасныя прыступкі, якія перагароджваюць шлях да дзвярэй з пад'езда. Калі адолееў гэты шлях і выбраўся з пад'езда, трэба дабрацца да прыпынку і сесці ў грамадскі транспарт. Калі вы дабраліся да прыпынку без праблем, вам пашанцавала. Але трэба яшчэ дачакацца, калі прыйдзе транспарт, прыстасаваны для перавозу чалавека ў інваліднай калясцы...» Гэта словы Таццяны Крышталь, жанчыны, якая вымушана штодня перамяшчацца ў прасторы пры дапамозе інваліднага крэсла.**

### «НЕ ЗАЦЫКЛІВАЦЦА НА ПАНДУСЕ»

Такіх, як Таццяна, у нашай краіне дзясяткі тысяч. Але ці часта мы бачым людзей з абмежаванымі магчымасцямі на вуліцах, у транспарце, грамадскіх месцах? Між тым, інваліды маюць такое ж права на паўнавартаснае жыццё, як і людзі без інваліднасці. Але ў большасці выпадкаў яны проста пазбаўлены выбару — дзе жыць, вучыцца, працаваць... А многіх адсутнасць безбар'ернага асяроддзя нават пазбаўляе магчымасці пакідаць сваё жыллё.

Адна з мэт дзяржаўнай палітыкі — паляпшэнне якасці жыцця людзей з інваліднасцю. Цяпер дзейнічае «Дзяржаўная праграма па стварэнні безбар'ернага асяроддзя жыццядзейнасці фізічна аслабленых асоб». Яна разлічана на 2011 — 2015 гады і ўключае ў сябе развіццё грамадскай інфраструктуры і транспарту, прыстасаванне аб'ектаў медыцыны, адукацыі, органаў улады да безбар'ернага асяроддзя, удасканальванне заканадаўчай базы.

Відавочна, што, апроч усяго пералічанага, адну з роляў адыгрывае якасць і даступнасць жылля для людзей з інваліднасцю, але гэтае пытанне шырока ніколі не абмяркоўвалася: справаздачы па арганізацыі безбар'ернага асяроддзя ў нашай краіне датычацца ў першую чаргу грамадскай інфраструктуры. На гэтую тэму разважалі ў Мінску прадстаўнікі Офіса па правах людзей з інваліднасцю.

**Немагчыма прадказаць, дзе і калі з'явіцца чалавек з асаблівымі патрэбамі, таму думка будаваць жыллё для «перспектыўных» інвалідаў з'яўляецца абсурднай.**

«Калі мы кажам пра безбар'ернае асяроддзе, часцей за ўсё ўяўляеш чалавека ў інваліднай калясцы ці з белым кіем. Насамрэч у безбар'ерным асяроддзі маюць патрэбу і мамы з каляскамі, і пажылыя людзі... Ды нават чалавек, які ідзе на працу ці вяртаецца з яе, — гэта два розныя чалавекі з пункту гледжання траўматызму», — лічыць **каардынатар Офіса па правах людзей з інваліднасцю Сяргей ДРАЗДОЎСКІ**.

Нягледзячы на тое, што ў праектах будаўніцтва закладаюцца магчымасці ўсталявання пандусаў каля пад'ездаў, праблема даступнасці жылля не вырашаецца комплексна. Бо доступ у пад'езд для каляскі ёсць, але сам пад'езд не прыстасаваны для перамяшчэння: мае высокія парогі, вузкія ліфтавыя шахты і праёмы дзвярэй, куды не праходзіць інвалідная каляска.

«Не трэба зацыклівацца толькі на пандусе да пад'езда, — заўважае Сяргей Драздоўскі. — Інваліднасць патрабуе асаблівых умоў для пражывання чалавека, звязаных з эрганомікай жылля. Яго канструкцыя павінна быць такой, каб жыццё чалавека з інваліднасцю не пераўтварылася ў пастаяннае пераадольванне бар'ераў».

### РЭКАНСТРУКЦЫЯ ЦІ АБМЕН?

У якасці выйсця з сітуацыі можна разглядаць некалькі варыянтаў. Першы — рэканструкцыя жылля пад умовы безбар'ернага асяроддзя. Але нават калі чалавеку ўдаецца дамагчыся станоўчага рашэння на ўсталяванне таго ж пандуса, яшчэ як мінімум год яму давядзецца чакаць выканання, таму што сродкі закладваюцца на бюджэт толькі наступнага года. І, як адзначыла **юрыст Офіса па правах людзей з інваліднасцю Вольга ТРЫПУЦЕНЬ,** калі для органаў улады гэта проста праца, для інваліда гэта жыццё. Але і рэканструкцыя часта бывае тэхнічна немагчымай, таму што праёмы дзвярэй у тую ж прыбіральню, на балкон, на кухню недастаткова шырокія для інваліднай каляскі.

**Калі мы кажам пра безбар'ернае асяроддзе, часцей за ўсё ўяўляеш чалавека ў інваліднай калясцы ці з белым кіем. Насамрэч у безбар'ерным асяроддзі маюць патрэбу і мамы з каляскамі, і пажылыя людзі...**

Яшчэ больш крытычная сітуацыя ў сельскай мясцовасці, дзе традыцыйная прыватная забудова не прадугледжвае не толькі элементаў безбар'ернасці, але не падлягае нават рэканструкцыі. Апроч таго, што часта ў вясковыя дамы не праведзена вада і ўсе ўмовы знаходзяцца на вуліцы, паўстае праблема і з расчысткай тэрыторый ад снегу ў зімовы перыяд.

У такой сітуацыі актуальным становіцца пытанне пра абмен недаступнага жылля на прымальнае для чалавека з інваліднасцю. Каардынатар Офіса па правах людзей з інваліднасцю ўпэўнены, што гэта ў першую чаргу клопат дзяржавы. Па словах Сяргея Драздоўскага, такі вопыт у нашай краіне ёсць, і гэта менш затратна, чым рэканструкцыя існых і будаўніцтва новых жыллёвых памяшканняў.

«Існуе рашэнне Мінгарвыканкама №710 аб тым, што па заяве інваліда-калясачніка аб жаданні абмяняць сваё жылое памяшканне на роўнае яму па плошчы, але з элементамі безбар'ернага асяроддзя, яго могуць уключыць у агульнагарадскі спіс па абмене жылля, — адзначыла Вольга Трыпуцень. — Аднак гэтае рашэнне датычыцца толькі Мінска, распаўсюджваецца толькі на дзяржаўны жыллёвы фонд і толькі на кватэры — пра пакоі гаворка не ідзе».

### НЕ ЎПАСЦІ Ў ЭЙФАРЫЮ

Беларускае заканадаўства стаіць на баку людзей з абмежаванымі магчымасцямі. Але, тым не менш, інваліды адстайваць свае правы, і нярэдка прайграюць. Прадстаўнікі Офіса звязваюць гэта з неадпаведнасцю паміж заяўленымі ў заканадаўстве нормамі і механізмам іх рэалізацыі на месцах.

Так, па пэўных крытэрыях грамадзянам (у прыватнасці, інвалідам-калясачнікам), якія маюць патрэ-



бу ў паляпшэнні жыллёвых умоў, могуць выдзеліць жыллё сацыяльнага карыстання. Яно не падлягае абмену і прыватызацыі.

«Але зафіксаваны выпадкі, калі ў такім жыллі адсутнічаюць элементы безбар'ернасці, пры тым, што ў адпаведныя органы прадастаўлены ўсе звесткі па стане здароўя чалавека, — заўважае Вольга Трыпуцень. — У стане эйфарыі ён уязджае ў новае памяшканне, падпісвае дакументы і тым самым аўтаматычна здымаецца з чаргі на паляпшэнне жыллёвых умоў. І адваротнага ходу ўжо няма: паўторна на чаргу яго не паставяць, таму што квадратнымі метрамі (хоць і не адпаведнымі для яго пражывання) грамадзянін забяспечаны».

Увогуле, гаворачы пра якасць даступнага жылля, варта адзначыць, што нават наяўныя элементы безбар'ернага асяроддзя ў ім не заўжды адпавядаюць нарматывам. Пандусы могуць быць без борцікаў і мець круты ўхіл, на верхняй іх пляцоўцы складана ці ўвогуле немагчыма развярнуцца. Зафіксаваны нават выпадак усталявання пандуса, які часткова ўпіраўся ў клумбу. Па словах Сяргея Драздоўскага, мясцовыя органы ўлады ў такіх выпадках проста разводзяць рукамі, спасылаючыся на прыватнага забудоўшчыка і жыллёвы кааператыў.

**Пандусы могуць быць без борцікаў і мець круты ўхіл, на верхняй іх пляцоўцы складана ці ўвогуле немагчыма развярнуцца. Зафіксаваны нават выпадак усталявання пандуса, які часткова ўпіраўся ў клумбу.**

❑ ❑ ❑

Магчыма, камусьці падасца зручным стварэнне асобнага раёна, прыстасаванага пад патрэбы людзей з інваліднасцю. Такі эксперымент правялі ў 1980-я гады ў Брытаніі. І праз дзясятак гадоў падчас правядзення маніторынгу высветлілася, што значная частка жыхароў раёна не мае інваліднасці. А тыя, для каго гэты раён прызначаўся, жывуць у сваім асяродку: побач з месцам вучобы, працы, пражывання родных. Да таго ж нельга забывацца на тое, што інваліднасць носіць набыты характар. Немагчыма прадказаць, дзе і калі з'явіцца чалавек з асаблівымі патрэбамі, таму думка будаваць жыллё для «перспектыўных» інвалідаў з'яўляецца абсурднай. Тым больш што такі мікраараён пераўтворыцца ў падабенства інтэрната, і гэта прывядзе не да інтэграцыі людзей з інваліднасцю ў грамадства, а, хутчэй, да іх адасаблення.

**Дзіяна СЕРАДЗЮК**

■

■ Прамая лінія

# ПАДТРЫМКА ПА АДРАСЕ

## Намеснік міністра працы і сацыяльнай абароны адказаў на пытанні нашых чытачоў наконт дзяржаўнай адраснай сацыяльнай дапамогі

**(Працяг. Пачатак — у нумарах за 21 і 22 лютага.)**

***— Ганна Рыгораўна Насевіч з Капыльскага раёна вам тэлефануе. Я пенсіянерка, з'яўляюся інвалідам 2 групы. Скажыце, ці маю я права на сацыяльную дапамогу?***

— Так, вы маеце такое права. Толькі дапамога бывае розная, і ёсць адпаведныя крытэрыі, якім чалавек павінен адпавядаць, калі ён звяртаецца па дапамогу. Скажыце, калі ласка, колькі складае ваша пенсія?

***— 2,5 млн рублёў. Але я купляю дарагія лекі.***

— З такой пенсіяй, Ганна Рыгораўна, дзяржаўную адрасную сацыяльную дапамогу вам не акажуць. Вам могуць дапамагчы толькі са сродкаў Фонду сацыяльнай абароны насельніцтва. Вы маеце права звярнуцца ва ўпраўленне па працы, занятасці і сацыяльнай абароне Капыльскага раёна і напісаць заяву. Яе разгледзяць і могуць аказаць вам такую дапамогу.

***— Быхавец Людміла Аркадзеўна са Смаргоні вам тэлефаную. Мне 73 гады, ведаю, што ў Мінску людзі, якія пакідаюць свае кватэры дзяржаве, атрымліваюць добрыя пакоі ў доме для састарэлых. У нас у Смаргоні няма такога дома, але ёсць у Гродне. Хацелася б годна завяршыць жыццё і атрымаць за кватэру ў Смаргоні прыстойны пакой у гродзенскім доме для састарэлых. Як гэта зрабіць?***

— Магу вам параіць Дом самастойнага пражывання пад Смаргонню.

***— Але там няма месцаў зараз.***

— Ёсць яшчэ дом-інтэрнат у Гродне…

***— Я хачу атрымаць камфортныя ўмовы…***

— У Гродзенскім доме-інтэрнаце якраз і зрабілі такое аддзяленне павышанай камфортнасці.

***— А ўзамен могуць забраць маю кватэру, я зраблю завяшчанне…***

— Не-не, яны не будуць вашу кватэру забіраць. Калі вы хочаце атрымаць догляд узамен сваёй кватэры, у Валожынскім раёне ёсць прыватны дом-інтэрнат. Вы можаце звярнуцца туды. Яны бяруць людзей з любой вобласці, нават з Расіі. А наогул, выбіраць вам.

***— Як ён называецца?***

— Зараз я вам дакладна не скажу. Пакіньце свой тэлефон, я даручу сваім спецыялістам, каб яны вам патэлефанавалі і далі адрас гэтага дома-інтэрната.

*(Што тычыцца дагавора пажыццёвага ўтрымання з утрыманнем (рэнты), які мела на ўвазе Людміла Аркадзеўна, то гэта дагавор, па якім атрымальнік рэнты (грамадзянін) перадае жылое памяшканне, якое яму належыць, ва ўласнасць г. Мінска, а плацельшчык рэнты (горад Мінск у асобе Мінскага гарвыканкама) абавязуецца пажыццёва ўтрымліваць грамадзяніна. Гэта значыць, дае права бясплатнага пражывання ў доме-інтэрнаце «Світанак» або сацыяльнага абслугоўвання на даму і атрымання ад дзяржавы выплаты рэнты за кватэру.*

*Як стала вядома «Звяздзе», у 2016 годзе, пасля вывучэння вынікаў гэтага эксперымента, будзе разгледжана пытанне аб магчымасці аказання такой паслугі на тэрыторыі ўсёй краіны. —* **Рэд.***).*

***— Аляксандр Аляксеевіч, гэта Галоцік Лідзія Сяргееўна з Капыльскага раёна. У мяне пытанне пра падгузкі. У мяне жыве брат, прапісаны ў Вілейскім раёне. Ён інвалід 2 групы, перанёс інсульт. Раней жыў з мамай, але яна памерла. Таму я забрала яго даглядаць. Цяпер яму купляю падгузкі. Скажыце, ці належыць нам дапамога на іх набыццё?***

— На жаль, такая дапамога даецца толькі інвалідам 1 групы. А вы не звярталіся да дактароў, каб перааформіць яму групу інваліднасці? Яшчэ вам трэба зарэгістраваць яго ў сябе.

***— Я зарэгістравала.***

— І вам трэба, калі да вас прыйдзе доктар, распытаць яго: можа, вашаму брату трэба ўжо прызначыць 1 групу?..

***— Добры дзень! Вас турбуе інвалід 1 групы з Любанскага раёна Рамановіч Рыгор Еўстахіевіч. Я ўжо восем гадоў з'яўляюся інвалідам 1 групы, калясачнік. Ці магу я разлічваць на нейкую грашовую дапамогу?***

— Рыгор Еўстахіевіч, а якую пенсію вы атрымліваеце?

***— 2,4 млн рублёў.***

— Пры такой пенсіі на адрасную сацыяльную дапамогу вы права не маеце. Ваша пенсія перавышае неабходныя крытэрыі. Але вы можаце звярнуцца па матэрыяльную дапамогу, якая выдзяляецца для пенсіянераў і людзей з інваліднасцю за кошт сродкаў Фонду сацыяльнай абароны насельніцтва.

***— У мяне ёсць яшчэ пытанне: ці маю я права на які-небудзь сродак перасоўвання, акрамя інваліднай каляскі?***

— Такія сродкі выдаткоўваюцца згодна з заключэннем урачэбнай камісіі. Вам была прадугледжана інвалідная каляска — і вам яе выдзелілі. Што тычыцца аўтамабіля, то ў нашай краіне яго не даюць нікому.

***(Заканчэнне будзе.)***

**Святлана БУСЬКО**

■

**ДАВЕДКА «ЗВЯЗДЫ»**

### Што такое штомесячная і аднаразовая сацыяльная дапамога

*Калі вы з'яўляецеся малазабяспечанай сям'ёй і ваш сярэднедушавы даход па аб'ектыўных прычынах ніжэйшы за велічыню бюджэту пражытковага мінімуму (сёння БПМ складае 1 128 070 рублёў), то, у адпаведнасці з Указам Прэзідэнта ад 19 студзеня 2012 года № 41 «Аб дзяржаўнай адраснай сацыяльнай дапамозе», вы маеце права звярнуцца ў тэрытарыяльнае ўпраўленне па працы, занятасці і сацыяльнай абароне, каб вашай сям'і прызначылі дзяржаўную адрасную сацыяльную дапамогу ў выглядзе штомесячнай сацыяльнай дапамогі ад аднаго да шасці месяцаў.*

*Калі вы апынуліся ў цяжкай жыццёвай сітуацыі (поўная непрацаздольнасць па прычыне інваліднасці ці дасягнення 80-гадовага ўзросту, няздольнасць да самаабслугоўвання ў сувязі з хваробай, а таксама стыхійныя бедствы, катастрофы, пажары і інш.), вам можа быць прадастаўлена аднаразовая сацыяльная дапамога пры ўмове, што сярэднедушавы даход вашай сям'і не перавышае 150% бюджэту пражытковага мінімуму (Сёння — 1 692 000 рублёў). Аднаразовая сацыяльная дапамога прызначаецца сем'ям, як правіла, адзін раз на працягу года.*

*Дзяржаўная адрасная сацыяльная дапамога ў выглядзе штомесячнай або аднаразовай сацыяльнай дапамогі прадастаўляецца на набыццё прадуктаў харчавання, лекаў, адзення, абутку, школьных прылад і на іншыя патрэбы для забеспячэння нармальнай жыццядзейнасці, а таксама на аплату (цалкам або часткова) жыллёва-камунальных паслуг.*

# У ГОСЦІ ДА БЕЛАРУСКАГА «РАБІНЗОНА»

**Нават выкарыстоўваючы два навігатары, карэспандэнты «Звязды» з цяжкасцю зарыентаваліся па дарозе да дзіўнага чалавека, які пераехаў жыць з Мінска, як ён сам кажа, «на край свету». Тут, ва Узрэччы Шумілінскага раёна, мужчына большую частку года жыве зусім адзін. Назірае за прыродай, фатаграфуе звяроў, рыбачыць, піша апавяданні ў беларускія і замежныя часопісы для паляўнічых і рыбакоў. Піша на рускай, англійскай і нямецкай мовах.**

**Большую частку інтэрв'ю ў яго давялося браць літаральна «на хаду». Ледзьве паспяваў за «рабінзонам», які даволі хутка перасоўваўся па лясной дарозе на незвычайным самаробным веласіпедзе.**

### «У ГОРАДЗЕ НЕ ЖЫЦЦЁ, А «МУРАШЫНАЯ МІТУСНЯ»

Аўтар гэтых радкоў і пазаштатны фотакарэспандэнт рэдакцыі Віктар Нікалаеў спачатку праехалі паварот да вёскі, дзе жыве Дзмітрый Воінаў.

Сустрэлі нас гаспадар дома і Джып — маленькі сабака. Хвастаты вельмі нерваваўся, убачыўшы двух незнаёмцаў. Да брэху Джыпа далучылася вялізная аўчарка, якая, на шчасце для нас, была ў вальеры.

— Ну вы, хлопцы, здзівілі! Нават мая малодшая сястра і тая амаль адразу зразумела, дзе трэба паварочваць. Я ж вам казаў: калі павернеце направа ад помніка воінам, палеглым у Вялікай Айчыннай, трохі трэба праехаць. І першы будынак, на даху якога ўбачыце антэну вышынёй з дзевяціпавярховік, — мой дом, — здзіўляўся Дзмітрый.

Дарэчы, вышыня антэны насамрэч 18,5 метра. Гаспадар пажартаваў. Як і падчас гутаркі з прыяцелем па тэлефоне: «У мяне тут журналістаў поўная хата, давай потым пагаворым!» Яшчэ да з'яўлення ў Беларусі мабільнай сувязі гэтая антэна выкарыстоўвалася «рабінзонам» для таго, каб гаварыць па рацыі: другая антэна — на «УАЗіку» Дзмітрыя і дзве ручныя станцыі — для гасцей. Напрыклад, людзі прыехалі на рыбалку, выклікаюць па рацыі гаспадара дома, маўляў, прыязджай, забяры нас з лодкай!

Заходзім у невялікі дамок. Адразу здзіўляе, што дзвярны праём настолькі нізкі, што нават мне з маім ростам 168 сантыметраў давялося прыгнуцца, каб увайсці.

— Не я дом гэты будаваў, 14 гадоў таму купіў пад дачу. Былы гаспадар прадаваў яго па тых часах дорага. Запрасіў мяне сюды і пачаў на «Ніве» вазіць па наваколлі. І проста над намі арлан-белахвост спікіраваў. Калі гэта адбылося, я дакладна зразумеў, што хату купляю. Гэта такая рэдкасць — убачыць арлана-белахвоста. Я ж паляўнічы і ўсіх ведаю птушак. У арлана размах крылаў два метры (для параўнання: у ястраба-цецяроўніка — метр). Прадавец жылля мне ў сваю чаргу гаварыў, што гэты дом быў пабудаваны ў пасляваенныя гады. Астатнія пяць дамоў, якія ёсць у вёсцы, — дачы, — распавядае Дзмітрый.

Наш фатограф, які добра разбіраецца ў жыццёвых пытаннях, падказаў гаспадару, што такія праёмы дазваляюць лепш захоўваць цяпло ў доме. Дзмітрый пагадзіўся і пачаў разліваць гарбату з зёлак, сабраных летам.

Дзмітрый не любіць распавядаць пра тое, дзе раней працаваў.

— На «Інтэграле» праграмістам. Я ж цяпер пенсіянер, якая розніца? Па адукацыі матэматык. Бізнесам у праграмаванні і ў лясной прамысловасці ў гады перабудовы займаўся. Потым мяне запрасіла працаваць нямецкая фірма, якая недалёка ад Кёльна паддоны робіць. Мы пастаўлялі немцам дошкі для вырабу паддонаў. Быў у мяне потым свой завод дрэваапрацоўчы — у Шуміліне. Але надакучыла ўсё, — адказвае ён на мае пытанні.



З Мінска пераехаў «на прыроду» гадоў шэсць таму. У яго ў горадзе дзве дачкі. Старэйшая па спецыяльнасці архітэктар-дызайнер, малодшая — ветэрынарны ўрач.

— А не сумуеце па дочках, горадзе?

— А што горад? Вось быў у Мінску. У двары няма месца аўтамабіль паставіць. І трэба было шукаць, каб яго на ноч пакінуць. А потым хвілін 40 прыйшлося дабірацца да кватэры. У горадзе не жыццё, а мурашыная мітусня. Маці мая, дарэчы, з Мінска родам, а бацька — з Ленінграда. А пазнаёміліся яны ў Чалябінску. Там я і нарадзіўся. Бацька абараніў дысертацыю, а да гэтага ён працаваў начальнікам санэпідстанцыі Чалябінска. Мы пераехалі ў Мінск, таму што там ствараўся інстытут эпідэміялогіі і мікрабіялогіі, — кажа Дзмітрый.

### ФОТАПАЛЯЎНІЧЫ З «ЗАЛАТЫМІ РУКАМІ»

«Рабінзон» спачатку адказваў на мае пытанні, як на допыце — неахвотна. Затое з вялікай цікавасцю стаў абмяркоўваць з фатографам нюансы фотатэхнікі. Гаварылі пра лінзы, аб'ектывы, нейкія аксесуары, незразумелыя мне — чалавеку, які рэдка здымае нават на лічбавую «мыльніцу». Дзмітрыя зразумець можна, бо ён з фанатызмам фатаграфуе насельнікаў лесу, падводнага свету. Вядзе свой блог у інтэрнэце. Знайдзіце яго абавязкова, нават калі вы не захапляецеся паляваннем і рыбалкай. Проста пачытайце апавяданні Дзмітрыя пра лес, пра звяроў. Атрымаеце велізарнае задавальненне.

Пакуль яны, як дзеці, абмяркоўвалі чарговую «фотацацку», я ўбачыў металічную «раму» на падлозе.

— Тут будзе стаяць рэдуктар і колы ці гусеніцы, а тут — перадок ад веласіпеда, з адным колам замест гэтых «рагоў». Такім чынам атрымаецца трансформер, і культыватар, і электратрактарок, і снегаход, і іншае, — тлумачыць Дзмітрый.

Паводле яго слоў, ён майструе і для задавальнення, і таму, што жыццё прымушае. Напрыклад, змайстраваў электравеласіпед, на якім і зімой ездзіць. Камплектуючыя заказваў у інтэрнэт-крамах Кітая, ЗША, Канады. Веласіпед з электрычным маторчыкам магутнасцю ўсяго 2 кВт. Пры гэтым хуткасць можа развіваць каля 60 кіламетраў за гадзіну. Пры вазе ўсяго 30 кіло на ім можна перавозіць вялікі груз. 60 кілаграмаў лёгка пацягне! Такі ж ён зрабіў адной з суседак-дачніц. Не адмовіў у будучыні зрабіць аналагічны транспартны сродак і фатографу «Звязды», які марыць на такіх колах рабіць рэпартажы для рэдакцыі.

— Гатую на дровах. Прадукты купляю ў аўтакраме. Ваду для душавой кабіны награвае печ… Калодзежа каля дома няма. Спрабаваў былы гаспадар бурыць зямлю і не знайшоў вады. Яна можа быць на гары, а пад гарой і на глыбіні 10 метраў суха — ніякай вады няма, — працягвае «рабінзон».

Па ваду да калодзежа ў вёсцы хадзіць далёка, а што рабіць? А непітную ваду пампуе з сажалкі.

Ён паказаў нам свае паляўнічыя трафеі: рогі, чарапы і гэтак далей.

— А вось, глядзіце, шкурка тхара. Ён забіў двух маіх трусоў. У пастку трапіў гэты тхор, не буду ж я страляць у трусятніку. Гэта — прыдзвінскі тхор. Ён па памерах як норка, і вонкава, калі зверху глядзець, — адзін да аднаго норка, а самка ў яго маленькая і рудая, як у звычайнага хатняга тхара, — паказвае гаспадар.

І прызнаўся, што ўжо не забівае звяроў, а займаецца фотапаляваннем.

— Сёння, да вашага прыезду, арлана бачыў: яго атаку на казулю. Вельмі рэдка такое можна ўбачыць. Я ведаю, што недалёка ад майго дома тры арланы жывуць… Шкада, зняць не паспеў, у наступны раз, — дзеліцца ўражаннямі фотапаляўнічы.

Ён плануе ўсталяваць у лесе відэакамеры, каб наведнікі яго блога маглі назіраць анлайн-трансляцыю з месцаў пражывання дзікоў…

### ЗНАЙШОЎ МАЎГЛІ, БАЧЫЎ НЛА

Дзмітрый паказаў нам «УАЗ» у гаражы, які адначасова з'яўляецца дрывотняй. Жыўнасць паказаў: дзвюх коз, трусоў. Курэй, сказаў, тут немагчыма разводзіць, таму што драпежныя птушкі на іх нападаюць — канюкі і ястрабы. Ёсць у Дзмітрыя і сажалка ўласная, дзе рыбу разводзіць. Робіць ля яе зручную «альтанку» для рыбакоў.

— Толькі для знаёмых. Займацца аграрным турызмам мне не вельмі хочацца. Хочацца спакою, а не сачыць за тым, каб прыезджыя нічога не зламалі, у гісторыю якую-небудзь непрыемную не трапілі, — разважае Дзмітрый.

Пакуль ён ехаў на веласіпедзе, а я за ім бег, паспеў спытаць пра снежнага чалавека. Можа, бачыў яго Дзмітрый у беларускай глушы?

— Снежнага не бачыў, а вось маўглі знайшоў! Жыла ў гэтай вёсцы жанчына. У яе было двое дзяцей: дачка гадоў 4 і зусім яшчэ карапуз, які толькі пачаў хадзіць. Памятаю, на вальдшнэпа ўжо можна было паляваць. Увечары іду па лесе і чую: нешта ў кустах варушыцца. Прыгледзеўся, пралез, а там увесь пакрыты камарамі сядзіць абсалютна голы малы. І, што дзіўна, — не плача. Узяў яго на рукі і да мамкі аднёс. Яна распавяла, што пайшла ў лес — у ягады, даручыла дзяўчынцы сачыць за братам. Дзяўчынка заснула, а малы ўзяў і пайшоў.

А НЛА на Цянь-Шані бачыў. Талерка з гары да нас ішла. Уся свяцілася, ляцела насустрач нам і павялічвалася ў памерах. Потым «лопнула» і на палову неба «расцяклася». А на наступны дзень мы з таварышамі сустрэлі рыбакоў, а яны нам: «О, гэта адсюль відаць старт ракеты з Байканура». Я шмат дзе быў: і ў камандзіроўках, і турыстам, мабыць, усюды, акрамя Антарктыды, — здзіўляе нас Дзмітрый.

Дзмітрый з болем распавядае нам пра лес, у якім варварскім спосабам нарыхтоўваюць драўніну.

— Вось, глядзіце на месцы прыгожага бору цяпер буралом. Мінімум 130 гадоў было гэтаму лесу. Навошта ж такім варварскім спосабам высякаць дзялянку? Вынялі ўсе ветраапорныя дрэвы, астатнія валіць вецер. Хлам не прыбралі. Цяпер тут звер не з'явіцца: казуля, алень і іншыя. І чалавек тут ужо з цяжкасцю перасоўваецца. А потым лес зарасце малиннікам. І такі «лес» можа цалкам выгараць, — вядзе нас па бураломе.

Не мог не спытаць у Дзмітрыя пра сэнс жыцця. Можа, яму, пустэльніку, дадзена гэта зразумець?

— Пытаннем сэнсу жыцця ў асноўным цікавяцца юнакі і студэнты-рамантыкі. Для мяне, напэўна — у тым, што я жыву так, як хачу. Пры гэтым кожны дзень нешта адкрываю для сябе і здзіўляюся, — сказаў мне на развітанне Дзмітрый.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**
**Фота Віктара НІКАЛАЕВА,**
*Шумілінскі раён.*





## «КУХАРКА ЛІТОЎСКАЯ»: ДОЎГІ ШЛЯХ ДА БЕЛАРУСКАГА ЧЫТАЧА




### Першае выданне гэтай кнігі па-беларуску выйшла ў «Харвесце» паўгода таму, але перакласці яе Вацлаў Ластоўскі пры жаданні мог яшчэ ў 1911-м

**Сорамна, скажу я вам, панове, што так мала ведаем мы пра пані Вінцэнту Завадскую, аўтарку нашай самай даўняй і самай папулярнай кулінарнай кнігі — «Кухаркі Літоўскай» — і што толькі летась нарэшце выйшла яна ў беларускім (а таксама і ў рускім) перакладзе. А гэта ж, магчыма, абсалютны бестселер XIX стагоддзя ў Літве і Беларусі: з тых часоў перавыдадзены каля 20 разоў! Але аўтарка да нашых дзён так і застаецца амаль ананімнай. Дакладней, апроч імя, мы пра яе мала што ведаем. «Мы» — гэта ўсе, хто дагэтуль карыстаецца яе легендарнай кнігай, якая ўпершыню выйшла ў Вільні ў 1854 годзе, — літоўцы, беларусы, палякі, рускія. «Вось такія вы няўдзячныя, мужчыны», — скажуць феміністкі. І як паспрачаешся?..**

У тыя часы, калі жыла наша гераіня, жанчын пускалі мала ў якую сферу дзейнасці: толькі дзеці, царква, кухня. А як напісала жанчына, пры ўсіх тых абмежаваннях, самую папулярную кнігу XIX стагоддзя, дык не знайшлося чалавека, які б занатаваў дэталі такой незвычайнай біяграфіі. Мы ведаем пра яе прыкладна столькі ж, колькі пра Еўфрасінню Полацкую, якая жыла на 800 гадоў раней... Усяго толькі і звестак: паходзіла з сям'і віленскага выдаўца Аляксандра Жулкоўскага, выйшла замуж таксама за выдаўца — з патомнага друкарскага роду, Адама Завадскага, чыя сям'я надрукавала нямала славутых у нашым краі кніг. Але не ведаем ані даты народзін, ані шлюбу — толькі дату смерці, 27 жніўня 1894 года. Была, відаць, на некалькі гадоў маладзейшая за мужа Адама (нар. у 1814), але пра гэта можна толькі здагадвацца. Не захавалася ніводнага партрэта Вінцэнты. Толькі магіла на віленскім Антокалі. Сціплая была жанчына. Першае выданне сваёй кнігі падпісала толькі крыптонімам — W.A.L.Z. За 6 гадоў да гэтага рэдагавала іншую кнігу для хатніх гаспадынь нашай зямлячкі з-пад Барысава Ганны Цюндзявіцкай, якую часта блытаюць з «Кухаркай», — «Літоўская гаспадыня».

І ўвогуле, іншыя аўтары на яе працы атрымалі больш здабыткаў, чым сама Вінцэнта Завадская. Вось, напрыклад, самая вядомая дарэвалюцыйная руская кулінарная аўтарка — Алена Малахавец, «ікона стылю», як любяць цяпер казаць. Яе кніга «Падарунак маладым гаспадыням» вытрымала больш за 40 перавыданняў, а з чаго пачалася, ведаеце? Калі выходзіла будучая руская славутасць замуж за архітэктара-літвіна Францa Малахаўца, дык атрымала ад мужа ў падарунак «Кухарку Літоўскую». І менавіта натхніўшыся нашай кулінарнай энцыклапедыяй, пачала ствараць рускую, у якую ўвайшлі вялікія кавалкі з кнігі Завадскай — без пазначэння крыніцы.

Першы беларускі (і, дарэчы, першы рускі) пераклад славутай «Кухаркі Літоўскай» выйшаў у свет паўгода таму, у жніўні 2013 года. А ведаеце, калі з'явіўся першы літоўскі (балцкі) пераклад? Ажно ў далёкім 1907 годзе, на 106 гадоў раней за беларускі. А ў 1911-м — вольная адаптацыя кнігі ў літоўскім нацыянальным духу, «Падручнік для хатніх гаспадыняў», ад дзвюх сёстраў Іваноўскіх, якія пісалі пад псеўданімам Lazdynu Peleda («Сава з арэшніку»).

Між іншым, малодшая сястра з гэтага дуэта, Марыя, была жонкай вядомага беларускага дзеяча Вацлава Ластоўскага, так што назіраць за тым, як жоначка прыстасоўвае славутую кнігу сціплай пані Вінцэнты для патрэб літоўскага нацыянальнага адраджэння, ён мог на ўласныя вочы. Шкада, аднак, што яго ўвага доўга на кулінарнай тэме не затрымлівалася. Калі-нікалі ён рабіў у сваіх узнёслых творах лірычныя адступленні — то пра кнышы, то пра бацвінне,



але, відаць, у цэлым лічыў гэта справай «бабскай». А вось шкада, што не ўзяўся перакласці «Кухарку Літоўскую» на беларускую яшчэ 100 гадоў таму. Вось вам і розніца паміж нашымі адраджэннямі. Літоўскае нейкае больш практычнае выходзіць: кнігу там кулінарную перакласці або адрадзіць вытворчасць пітнога мёду. Нашае ж нейкае больш узнёслае, з вершамі і шэсцямі, з роздумам пра Вечнасць.

Дзякуй, аднак, Богу і перакладчыцы Наталлі Бабінай, што, хаця і са спазненнем на добрую сотню гадоў, але пераклад такі з'явіўся. Нават два — беларускі і рускі. Цяпер сучасны беларускі чытач зможа сам аднавіць смак колішніх шляхецкіх бясед. Праўда, не ўсе, як мне здаецца, «западуць» на экзатычныя пудынгі ды мельшпайзы, на штуфады, легуміны ды драздоў-піскуноў. Але, напрыклад, літоўскія завівáныя зразы або Тышкевічаўскія калдуны, бадай, застануцца ў нашым кулінарным каноне назаўжды.

Перад перакладчыцай стаяла складаная задача — праз адсутнасць беларускамоўнай агульнапрызнанай тэрміналогіі, зменах у даступнасці прадуктаў і ў самой тэхналогіі прыгатавання, якая ўжо не можа аддаваць цэлыя дні нейкай адной страве, не маючы штату прыгонных кухцікаў. Ды і звычайных памылак у арыгінальных выданнях Завадскай нямала. «Мы спраўджвалі змест па выданнях 1938-га і 1911-га, ніякіх скарачэнняў не рабілі, бо стаяла задача захаваць тэкст як гістарычны помнік, — кажа Бабіна. — Не папраўлялі, нават калі ў рэцэптуры былі нейкія памылкі. Але тады рабілі заўвагі перакладчыка: вось тут, напрыклад, трэба страву пасаліць або з рыбы трэба жабры выбраць, але аўтарка пра гэта не піша. Для тагачасных гаспадынь гэта было само сабой зразумела, а цяперашняму чытачу варта тое падказаць».

Так што павіншуем перакладчыцу, выдавецтва «Харвест» і ўсіх нас з гэтым несумненным нацыянальным здабыткам. Толькі пра адну важную хібу трэба сказаць: выданне выключна багата ілюстраванае, але ані слова не сказана пра крыніцы гэтых ілюстрацый. Складваецца ўражанне, што мала якія з іх — вынік рэальнага прыгатавання страў па рэцэптах пані Вінцэнты. Так што наступная задача ў справе актуалізацыі нашай кулінарнай спадчыны — гэта адбор з былога «літвінскага» канону найбольш жыццяздольных у сённяшніх умовах страў і візуальная фіксацыя іх прыгатавання — не толькі ў кнігах, але і на відэа і разнастайных мультымедыя. Ну і, вядома, вяртанне ў сямейны побыт і грамадскае харчаванне!

#### Верашчака ад Вінцэнты Завадскай

**Інгрэдыенты:**

*2 кг свіной карэйкі,*
*100 г сала*
*1-2 шклянкі бурачнага квасу*
*«англійскі» (духмяны) перац*
*150 г жытняга хлеба*

**Спосаб прыгатавання:**

**Карэйку насекчы парцыйнымі кавалкамі, пасаліць і падсмажыць на патэльні на сале да ўтварэння залацістай скарынкі. Уліць бураковы квас (чым больш квасу, тым кіслейшай атрымаецца верашчака) і як след пракіпяціць. У канцы варкі дадаць надзёрты хлеб, сочачы, каб соус не атрымаўся занадта густым, усё перамяшаць і пратушыць. Такую верашчаку можна гатаваць і з ялавічыны.**

■ Мясціны, знітаваныя з душой

## ЯШЧЭ ЖЫВЕ ЦЯПЛО БАЦЬКОЎСКАГА ЖЫТЛА



**Быццам нічым не адметная вёсачка ў Віцебскай вобласці Сенненскага раёна — Лапатнікі — і ў той жа час вельмі адметная... толькі, напэўна, не падзеямі, не гісторыяй старажытнай, не замкамі, не сядзібамі з паркамі, а людзьмі, незвычайнай культурай.**

У гэты год лета плакала няспынна, з любой нагоды, толькі зрэдку абціраючы слёзы з вокнаў. Яно дыхала ранішнімі туманамі, акрапляючы вільгаццю кветкі лубіну, які рассяліўся паўсюль, расой вычэрчвала кожную травінку, акантоўвала кожны лісцік, уволю, нібы ў запас, паіла зямлю. Зарадзіць дождж з раніцы і да самай ночы ніяк не аціхне, плача і плача пра сваё, пра набалелае, плача днямі напралёт, скардзіцца камусьці. Не цягнецца жыта да ласкавага святла, не спеюць яблыкі, не пырхне матыль з кветкі, затрымцеўшы ўзорамі крылаў, а лета ніяк не ўсміхнецца цеплынёй, маўчыць — і прабачэння папрасіць у яго няма каму. Час ужо і слівам паспяваць, ды яны так і вісяць зялёныя, няспелыя на галінках, кожны дзень расінкамі, дажджынкамі абмываюцца. Стаіць вёска ў зеляніну адзетая, што ні двор — сад, пад нагамі зямля, над галавой неба, да гарызонту поле, дзе паспявае лён, вада са студні, уначы далёкія агеньчыкі суседняй вёскі, па раніцах росная трава па пояс.

Раскінуліся дзве згубленыя ў беларускай глыбінкі вёсачкі ўздоўж берагоў ракі, якая некалі бегла ў яры, і глядзяць адна на адну агародамі, палямі жыта, вітаюцца лужкамі кветак, што збягаюцца ў нізінцы, там жа дзеляцца навінамі, якія рэхам даносяцца з двух бакоў.

Па-ранейшаму спяваюць пеўні ў пару, гукаюць раніцу нязменна — пеўні па-свойму важныя, часам з хвастамі, якія страцілі львіную долю сваёй прыгажосці ў баях за важнасць і лідарства, разгульваюць уздоўж дамоў, зранку сустракаюць сонейка.

Тут заўсёды задзірыста і радасна патрэсквае агеньчык у печы, аблізваючы сухія палены, грэе пакой, жадаючы цёплых, салодкіх сноў на высокім жалезным ложку, які нібыта з'явіўся з кадраў старога фільма. І пах... мілы пах вясковай хаты — у кожнага ён свой, непаўторны. Як зашчыміць сэрца, калі, ідучы па вуліцы, раптам адчуеш неспадзявана далёкі, ледзь улоўны водар, які толькі нагадае пра гэты дом, верне да яго думкі, абудзіць успаміны.

Ведаеце, якія на смак маленькія жоўтыя ледзь-ледзь паспелыя грушы, што працягвае табе на зморшчанай ад пастаяннай працы далоньцы родны чалавек? І дзе знайсці іх можна было сёлета? У іх клопат і любоў, у іх доўгае расстанне, у іх шчасце і радасць, у іх цеплыня і ўвага — у іх усё і трохі больш. Толькі тут вараная ў чыгунку каша смачная і духмяная, і толькі тут ледзь абсмажанае сала мае самую апетытную чырвань, і толькі з гэтай градкі цыбуля такая зялёная.

Вузкая сцяжынка, правёўшы праз вёску, выглядвае ў поле, нырае ў лён і кліча за сабой міма васількоў (нідзе больш мне не прыходзілася бачыць малюсенькія васількі пад нагамі), запрашае прайсці да бліжэйшага гаю і, апынуўшыся ў засені бяроз, пакланіцца ды ўспомніць продкаў. Вясковыя могілкі... Тут мой прадзед, прабабуля. Тут юная 18-гадовая дзяўчына — сувязная партызанскага атрада. Цяпер — юная, тады мне яна здавалася ўжо дарослай... Зморшчаныя бабуліны далоні прыбіраюць лістоту з драўлянага крыжа ды кладуць яблыкі з печывам для птушак. Усё як у далёкім-далёкім дзяцінстве. Толькі надвор'е падвяло, нібы ведала, што і ў гэты раз расстанемся надоўга...

Здаецца, што старэнькія, крыху пакрыўленыя хаты вакол рады мне, рады гасцям як сваім сябрам... Бачу рукамыйнік у двары... Гэтак жа ласкава мурлыкае котка на лаўцы пад акном, па-ранейшаму гуляецца з папяровым банцікам.

Неба, нарэшце, перастала плакаць, слязінкі дажджу не калацілі адчайна ў акно, але сонца так і не выйшла правесці гасцей. Толькі ўначы злітавалася над людзьмі і прыадкрыла загадкавую, вабную чарнату неба з мірыядамі зорак, якія то перамігваюцца адна з адной у розных канцах галактыкі, а то і падаюць на зямлю, сарваўшыся з вышыні, як маленькі непаседа з дрэў у садзе. Я чакаю... чакаю, калі зваліцца на далоньку, працягнутую да шыбы, хоць адна з тых зорак, што, зрываючыся з роднай вышыні, разразаючы чорны аксаміт неба, выконваюць жаданні — або жаданні проста такія светлыя, што не спраўдзіцца не могуць. Вось і агні суседняй вёскі відаць удалечыні; падміргваючы з-за дрэў, ледзь адрозны гук грузавікоў, якія рэдка-рэдка праязджаюць дзесьці няблізка, і яркія серабрыстыя росчыркі зорак, што згараюць у атмасферы, ловячы на сабе зачараваныя позіркі людзей з самых розных вёсак і гарадоў. Амаль да світанку стаячы каля акна, ледзь дакранаючыся да шурпатасці рубленай сцяны дома, што будаваў дзедаў брат...

Удыхаю амаль забытыя пахі палявых кветак, паленаў, што дагараюць у печы, слухаючы мернае ціканне гадзінніка, не хачу адпускаць ні адной хвіліны гэтай ночы, секунды, імгнення... Яшчэ жыве цяпло бацькоўскага жытла і хаты ўздыхаюць комінамі...

**Алена ЧЫСТОВА.**

**P.S.** *Шаноўныя чытачы! Дасылайце і вы свае артыкулы на конкурс*

■ Рыштаванні Бацькаўшчыны

## «ЗАЧАРАВАНЫ ДВОР» І ГАСПАДАРЫ

### Сядзіба Манюшкі ў Смілавічах шукае інвестара

**Помніку гісторыі і культуры XIX стагоддзя шукаюць новага гаспадара праз аўкцыён, які адбудзецца 4 сакавіка. Кошт, ад якога будуць адштурхоўвацца, — 215 807 110 рублёў (альбо $22 202 па курсе Нацбанка). І гэта ўжо пасля таго, як спроба прадаць комплекс у снежні не прывяла да нейкага выніку. Але тады ён выстаўляўся за 1 079 035 549 рублёў. Істотная зніжка, відаць, абумоўлена тым, што ёсць зацікаўленасць перш за ўсё «прыстроіць» гістарычны палацава-паркавы ансамбль у добрыя рукі: зразумела, што ўкласці ў яго аднаўленне прыйдзецца значна больш. Да таго ж новы ўласнік павінен будзе пры аднаўленні захоўваць усе патрабаванні па рэстаўрацыі, якія існуюць у Рэспубліцы Беларусь.**

А працы і рэсурсаў спатрэбіцца ўкласці шмат. Таму што палацава-паркавы комплекс у Смілавічах складаецца з рэштак старога палаца, новага палаца, паркавай тэрыторыі і часткі гістарычнай агароджы. Але чым складаней задача, тым цікавей яе вырашаць. Ці не так? Бо насамрэч маёнтак у Смілавічах у розныя гістарычныя перыяды належаў прадстаўнікам славутых дынастый Вялікага Княства Літоўскага. А для культуры яго значэнне асаблівае: у XVIII стагоддзі гаспадаром маёнтка быў Міхал Казімір Агінскі (дзядзька аўтара цудоўных паланэзаў), але напрыканцы стагоддзя яно стала належыць Манюшкам. Дзед вядомага кампазітара, таксама Станіслаў Манюшка, і заклаў стары палац у стылі псеўдаготыкі (да нашага часу дажыла, напрыклад, трохпавярховая вежа з зубцамі). Яго сын Казімір заклаў батанічны і фруктовы сад. Але далей маёнткам валодаў не менш слынны род Ваньковічаў. У 1900 годзе да старога палаца быў дабудаваны новы, даволі выцягнуты — у стылі неаготыкі з элементамі стылю «мадэрн». Для гісторыі беларускай культуры гэты палацавы комплекс вельмі значны — асабліва ў сувязі з іменем кампазітара Станіслава Манюшкі, адна з опер якога, «Зачараваны замак», натхнёная духам дзедавага палаца.



Жыццё ў сценах палаца падтрымлівалася ў савецкі час: апошнім тут «гаспадарыў» Смілавіцкі аграрны каледж. Але час робіць сваю справу, а каб гістарычныя будынкі падтрымліваліся ў належным стане, патрэбны грошы. Усё спадзяванне на інвестара, які возьме на сябе клопат пра палацава-паркавы ансамбль. Насамрэч, паколькі Смілавічы зусім недалёка ад Мінска, то аддавочная турыстычная прывабнасць былой сядзібы Манюшкаў. А тут яшчэ 200-гадовы юбілей славутага кампазітара на падыходзе...

**Ларыса ЦІМОШЫК**

■ Год гасціннасці: ідэя

## ВЕЧАРЫНКА ПА-СТАЛІЧНАМУ: ГАРМОНІК, СВЕЧКІ І НАРОДНЫЯ ТАНЦЫ

**Я думала, што сапраўдныя вясковыя вечарынкі, пра якія расказвае мая бабуля, ужо не існуюць, таму і схадзіць на іх немагчыма. Гэта калі моладзь збіраецца ў адной хаце, хтосьці іграе на гармоніку, хлопцы запрашаюць дзяўчат, нават самых сарамлівых, і ўсе парамі танцуюць польку або кракавяк... Якім жа было маё здзіўленне, калі адным нядзельным вечарам, акурат на Грамніцы, я ў самым цэнтры сталіцы трапіла на беларускую вечарынку.**

У памяшканні панаваў лёгкі паўзмрок: толькі свечкі-лучыны аздаблялі яго сваім святлом. Каля адной сцяны, як і мае быць, ігралі гарманіст, дудар і скрыпачка. Побач прыстроіліся дзяўчаты, якія час ад часу зацягвалі прыгожыя старажытныя песні. Яшчэ адно дзейства адбывалася ў цэнтры залы, дзе хлопцы і дзяўчаты, мужчыны і жанчыны танцавалі. «Польку», «Кракавяк», «Карманчык» і многія іншыя беларускія танцы выконвалі яны ў гэты вечар. Акрамя весялосці, тут можна было адчуць глыбокі ўнутраны спакой (інакай кажучы, годнасць) уласцівы ўсім беларусам. Ад гэтага на душы рабілася добра і светла. Былі і павольныя, і хуткія танцы, скокі з элементамі гульні, а таксама тыя, у якіх трэба вальсіраваць. А ў адной дзеі галоўным было адбіванне рытму пантофлямі: пастукванне абцасаў гучала ледзь не грамчэй за музыку. Часам пары рухаліся ў карагодах, а тэмп музыкі пастаянна нарастаў.

**Хлопец з дрэдамі да пояса танцаваў з дзяўчынай у народным касцюме — вось дзе сапраўды сышліся мінулае і сучаснасць!**

Па народных строях, у якія апрануліся ўдзельнікі вечарыны, можна было зразумець, што яны прыйшлі сюды не проста з вуліцы, а загадзя падрыхтаваліся. Але была і такая пара, дзе хлопец (у сучаснай вопратцы) з дрэдамі да пояса танцаваў з дзяўчынай у народным касцюме, — вось дзе сапраўды сышліся мінулае і сучаснасць!

Калі ж раскрыць сакрэт, дзе і дзякуючы каму адбываліся ўсе гэтыя дзівосы, можна адзначыць, што гэта Студэнцкае этнаграфічнае таварыства ладзіла сваю вечарыну ў кавярні L'абрус, што каля Камароўкі. Усё адбылося дзякуючы таму, што гаспадары вырашылі істотна змяніць профіль і надаць кавярні сапраўдны беларускі каларыт (хаця і першапачаткова вечарына задумвалася як беларуска-еўрапейская). А моладзь з СЭТа, у сваю чаргу, імкнулася да таго, каб актуалізаваць адметную беларускую культуру і зрабіць яе запатрабаванай і цікавай у сучасным грамадстве. І гэта была іх першая сумесная вечарына.



**Дзяўчаты з «Горыні». У цэнтры — адна з удзельніц вечарыны.**

Распачыналася дзейства вялікім майстар-класам, які праводзіў этнахарэограф з Любані Сяргей Высквaрка. На працягу чатырох гадзін усе ахвотныя маглі спазнаваць азы беларускага народнага танца. Пасля быў невялічкі спеўна-свечкавы перформанс ад гурта «Горынь», які выконваў стрэчанскія песні. Гэта рабілася для таго, каб людзям, далёкім ад беларускай традыцыйнай культуры, было прасцей уліцца і самім прыняць удзел у свяце. **Арганізатары, сябры Студэнцкага этнаграфічнага таварыства Настасся Кухарэнка і Аляксей Чубат,** адзначылі:

— Мы бачым вялікую цікавасць да нацыянальных строяў, да свят. Бо народныя святы адрозніваюцца тым, што там няма гледачоў. На іх нельга набыць квіток і проста назіраць. Гэта нейкае дзейства: вечарынка, карагод, у якім усе ўдзельнічаюць. Атрымліваецца, што свята ідзе знутры, ты сам яго вывучаеш. Да таго ж і замежніку, які прыязджае ў нашу краіну, не цікава проста паесці піцы і выпіць колы. Яму хочацца найперш убачыць і адчуць на сабе тое, што звязана з Беларуссю, што ён не знойдзе больш нідзе.

Лагічна, што гаспадароў кавярні беларускія вечарынкі зацікавілі і па прычыне набліжэння чэмпіянату свету па хакеі, які Беларусь прыме ў маі гэтага года. Зразумела, што да нас завітае шмат балельшчыкаў. Але не менш важна для гасцей — убачыць нацыянальную аўтэнтыку. Таму пра тое, што прадставіць наведвальнікам, як сябе паказаць, трэба паклапаціцца загадзя.

Гаспадар кавярні Міхаіл Пінчук адзначыў, што вечарынка яму вельмі спадабалася. Асабліва каштоўным падалося тое, што дзеці, моладзь і людзі больш сталага веку разам адчувалі сябе ўтульна. Атрымалася добрая сяброўская кампанія. Ён плануе падтрымліваць гэтую ініцыятыву і надалей арганізоўваць у сваёй кавярні падобныя вечарыны.

Вяртаючыся з такой выдатнай імпрэзы, я разважала над тым, што, як ні парадаксальна, беларускую традыцыйную культуру ў пэўным сэнсе можна аднесці да разраду субкультур. Хтосьці цікавіцца рыцарствам, хтосьці панк-рокам, і таксама не ўсе — народным. Бо не сакрэт, што не кожны беларус умее выконваць беларускія танцы, не кожны ведае хаця б адну народную песню на роднай мове і толькі адзінкі маюць у сябе народныя касцюмы. Аднак што адрознівае беларускасць ад усяго іншага? Напэўна, тое, што, аднойчы зразумеўшы яе, забыць ужо не зможаш. І якой бы прафесіяй ты ні займаўся, як бы ні змяняў свой сацыяльны статус, любоў да свайго, сапраўднага ўжо ніколі не знікне і з часам будзе толькі мацнець.

**Ніна ШЧАРБАЧЭВІЧ**

■ Працяг тэмы

## ДВУХ- І ТРОХМОЎНЫЯ ПАКАЗАЛЬНІКІ?

**На мінулым тыдні мы пісалі пра змены, якія прапануюць унесці ў заканадаўства аб геаграфічных назвах і аб мовах. Літаральна праз пару дзён Дзяржаўны камітэт па маёмасці распрацаваў і прадставіў грамадскасці гатовы праект змен і дапаўненняў. Найменні геаграфічным аб'ектам плануюць даваць па-беларуску. Але гэта не ўсё...**

Пракаментаваць запланаваныя новаўвядзенні мы папрасілі **намесніцу начальніка ўпраўлення геадэзіі і картаграфіі Дзяржкамітэта па маёмасці Ірыну ЦІХАНАВУ.** Геаграфічныя найменні будуць давацца на беларускай мове, а пасля перакладвацца на рускую — у новай фармулёўцы ***больш не пазначана, што «спосабам транслітарацыі»***. Я запытала ў спецыяліста, якім чынам тады можа адбывацца перадача на рускай мове? Яна адказала, што спосабы пакуль не замацаваны. Новая рэдакцыя закона ўступіць у сілу з 1 студзеня 2015 года. Да гэтага часу плануецца распрацаваць тэхнічную дакументацыю, у якой будуць пазначаны магчымыя варыянты. Гэта можа быць транскрыпцыя, транслітарацыя, у некаторых выпадках пераклад і іншае.

У Законе «Аб геаграфічных назвах» будзе таксама прадугледжана, што ***на паказальніках назвы будуць адлюстраваны і па-беларуску, і па-руску***. З гэтага можна зрабіць выснову, што самі паказальнікі стануць большымі па памеры. Да таго ж дзяржаўнае двухмоўе зробіцца выразна акрэсленым. Аднак калі і на адной мове спецыялістам на месцах было складана граматна напісаць геаграфічныя назвы (што і спарадзіла скаргі ў вышэйшыя інстанцыі і прапановы змен у законе), то ці варта разлічваць на правільнасць двухмоўных паказальнікаў?.. І гэта ў той сітуацыі, калі нават спецыялістам складана адразу вызначыць спосаб перадачы з адной мовы на іншую. Такое новаўвядзенне, па словах спецыяліста, робіцца для таго, каб прасцей было арыентавацца тым, у каго карты мясцовасці на рускай мове.

Гэты ж пункт праекта змен у законе прадугледжвае і трэці радок на паказальніках: ***пры неабходнасці, пісаць назвы лацінкай,*** выкарыстоўваючы сістэму транслітарацыі з беларускай мовы. Ірына Ціханава патлумачыла, што лацінка можа выкарыстоўвацца на паказальніках, што знаходзяцца на вялікіх магістралях, дзе праязджаюць падарожнікі з далёкіх краін.

З меркаваннем пра тое, ці не прасцей было б прымаць назвы выключна па-беларуску і ўсюды выкарыстоўваць у такім варыянце (тады б да іх прызвычаіліся і свае, і чужыя), спецыяліст згадзілася. І дадала, што змены ў заканадаўстве ініцыяваны таму, што транслітарацыя не прыжылася. Аднак спосаб даслоўнага перакладу да тапонімаў не прымальны, бо тады яны перастаюць выконваць сваю асноўную функцыю — паказваць на канкрэтнае месца.

Ціханава прыгадала, што звычка ўжываць дзве назвы — *Кастрычніцкая і Октябрьская, Чыгуначная і Железнодорожная* — з'явілася ў савецкі час. А цяпер, паводле яе слоў, магчыма, варта было б адмовіцца ад такой традыцыі.

Прапанаваны праект змен яшчэ будзе ўзгадняць Савет Міністраў, Палата прадстаўнікоў і Савет Рэспублікі, таму яго нельга лічыць канчатковым.

**Ніна ШЧАРБАЧЭВІЧ**

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

по продаже имущества **ЧСТУП «Цемекс»,** расположенное по адресу: г. Гомель, ул. Барыкина, д. 309б:

| № лота | Наименование имущества | Стоимость имущества, выставленного на торги, рублей РБ | Начальная цена продажи лота, рублей (без учета НДС) | Задаток 5%, рублей (без учета НДС) | Сумма шага аукциона в размере 5% |
|---|---|---|---|---|---|
| 1 | Генератор теплового воздуха «Тепловей Т-100N» | 9844800 | 9844800 | 492240 | 492240 |
| 2 | Генератор теплового воздуха «Тепловей Т-100» | 9587200 | 9587200 | 479360 | 479360 |
| 3 | Установка для разгрузки сыпучих материалов | 18464495 | 18464495 | 923225 | 923225 |

**Организатор торгов – управляющий в деле о банкротстве ЧСТУП «Цемекс» Борейко Д.И.**

С имуществом (лотом) можно ознакомиться по месту его расположения в рабочие дни с 9.00 до 17.30.

**Задаток перечисляется до 10.03.2014 г. (включительно)** по реквизитам для оплаты задатка: р/сч. № 3012800000579 – текущий в белорусских рублях в ОАО «Белгазпромбанк» Гомельская областная дирекция, МФО 153001742, УНП 490000841.

**Условия продажи –** без условий.

После окончания торгов с победителем подписывается протокол и в течение 20 календарных дней заключается договор. Победитель торгов обязан оплатить стоимость покупки в течение 30 календарных дней после подписания протокола. Победителем аукциона признается участник, предложивший наибольшую цену покупки.

В случае признания торгов несостоявшимися, в связи с подачей заявления на участие в них только одним участником, возможна продажа лота этому участнику при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5%.

Затраты на организацию и проведение торгов, в том числе расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам торгов документации, необходимой для их проведения, возмещаются победителем торгов.

Для участия в аукционе необходимо подать письменное заявление с приложением: для юридических лиц – заверенные копии свидетельства о гос. регистрации, устав; для индивидуального предпринимателя – заверенная копия свидетельства о гос. регистрации; для физ. лица – копия паспорта.

**Срок подачи заявления с момента выхода настоящего объявления до 16.00 10.03.2014 года по адресу:** г. Гомель, ул. Ирининская, д. 20 (холл второго этажа Экономического суда Гомельской области по предварительному согласованию по тел. 80296542561, 80447678805).

**Дата, время, место проведения открытого аукциона 11.03.2014 года в 10.00,** г. Гомель, ул. Ирининская, д. 20 (холл второго этажа Экономического суда Гомельской области).

По вопросам ознакомления с имуществом (лотом) и участия в аукционе, приобретения имущества должника обращаться **по телефонам: (8029) 654 25 61; (8044) 767 88 05.**

---

**ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА** 26.03.2014 в 11.00 по адресу: 230015, г. Гродно, ул. Горького, 87 А, каб. №204, по продаже права заключения договора аренды недвижимого имущества сроком на **пять лет** для производственных целей (за исключением вредных производств), размещения офисов, складских помещений, оказания услуг. Организатор аукциона – РУП «Белтелеком» в лице Гродненского филиала, 230015, г. Гродно, ул. Горького, 87 А.

| Адрес арендуемого имущества | № Лота | Площадь, кв.м | Коэффициент от 0,5 до 3,0 | Начальная цена продажи, руб. | Размер задатка, руб. | Характеристика |
|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | 7 |
| Капитальное строение, здание автоматической телефонной станции, помещение на 1 эт., г. Гродно, ул. Ожешко, д. 9 | Лот № 1 | 17,1 | 2,5 | 367 650 | 36 765 | Помещение находится на первом этаже двухэтажного кирпичного здания в центре города. В помещении имеется естественное освещение, центральное отопление, в здании имеется водоснабжение, канализация, телефонизировано |
| Капитальное строение, здание АТС-2, помещение на 3 эт., Гродненская обл., г. Лида, б-р князя Гедимина, д. 3 | Лот № 2 | 70,4 | 2,5 | 1 513 600 | 151 360 | Помещение находится на третьем этаже четырехэтажного блочного здания в центральной части города. Имеется естественное освещение, центральное отопление, водоснабжение, канализация, электроснабжение, телефонизировано. Площади находятся в удовлетворительном состоянии |

Порядок проведения и оформления участия в аукционе определены Положением о порядке проведения аукционов по продаже права заключения договоров аренды капитальных строений (зданий, сооружений), изолированных помещений, машино-мест, их частей, находящихся в республиканской собственности, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 08.08.2009 №1049 (в ред. постановлений Совмина от 21.06.2012 № 570, от 08.01.2013 № 16, от 12.07.2013 № 607).

К участию в аукционе допускаются юридические и физические лица, в том числе индивидуальные предприниматели, предоставившие организатору следующие документы: представитель физического лица, индивидуального предпринимателя, юридического лица предъявляет организатору аукциона оригинал доверенности (документ, подтверждающий полномочия должностного лица), документ, удостоверяющий личность, заявление на участие в аукционе, заявление об ознакомлении с документами, порядком проведения аукциона, соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона, заверенную банком копию платежного документа о перечислении задатка на текущий (расчетный) счет организатора аукциона, документ, удостоверяющий личность (для физических лиц, для представителей физического лица, индивидуального предпринимателя, юридического лица), доверенность (документ, подтверждающий полномочия должностного лица) (для представителей физического лица, индивидуального предпринимателя, юридического лица), копию свидетельства о государственной регистрации (для индивидуальных предпринимателей и юридических лиц резидентов Республики Беларусь), легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписку из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть произведена не ранее чем за 6 месяцев до даты подачи заявления на участие в аукционе) или иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения (для юридических лиц – нерезидентов Республики Беларусь). Копии документов предоставляются без нотариального засвидетельствования.

Задаток перечисляется на субсчет 3012000040071 в филиале № 400 ГОУ ОАО «АСБ Беларусбанк», код 752, УНП 500826567, Гродненский филиал РУП «Белтелеком».

Участники аукциона уплачивают штраф в случаях, предусмотренных частью второй пункта 14 Положения о порядке проведения аукционов по продаже права заключения договоров аренды капитальных строений (зданий, сооружений), изолированных помещений, машино-мест, их частей, находящихся в республиканской собственности, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 08.08.2009 №1049 (в ред. постановлений Совмина от 21.06.2012 № 570, от 08.01.2013 № 16, от 12.07.2013 № 607), в размере 30 базовых величин.

Победителем аукциона признается участник, предложивший наивысшую цену за предмет аукциона. Победитель аукциона (лицо, приравненное к победителю аукциона) в течение 3 рабочих дней со дня его проведения обязан в установленном порядке перечислить на субсчет арендодателя сумму, за которую продан предмет аукциона, за вычетом внесенной им суммы задатка, а также возместить организатору аукциона затраты на его организацию и проведение. Договор аренды по результатам аукциона заключается в течение 10 рабочих дней со дня проведения аукциона и подписания протокола аукциона.

Прием документов на участие в аукционе осуществляется по адресу: 230015, г. Гродно, ул. Горького, 87 А, каб. 202 с 25.02.2014 по 25.03.2014 включительно в рабочие дни (с 9.00 до 16.00). Документы, поданные после 16.00 25.03.2014, не рассматриваются.

Информация о ранее проведенных аукционах была размещена в газете «Звязда» от 16.11.2013 № 216, от 20.07.2013 № 133.

**Телефоны для справок: (0152) 606805, (0152) 606801, факс (0152) 72 02 07.**

---

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОННЫХ ТОРГОВ ПО ПРОДАЖЕ ЗЕМЕЛЬНЫХ УЧАСТКОВ

в Жабинковском районе Брестской области в частную собственность граждан Республики Беларусь

| № лота | Адрес участка | Кадастровый номер | Общая площадь (га) | Целевое назначение использования участка | Начальная цена предмета аукциона (руб.) | Сумма задатка (руб.) | Расх. по подг. земел.- кадастр. док. (руб.) | Характеристика инженерных коммуникаций и сооружений на участке |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | Ракитницкий с/с, д. Задерть, 3В | 122582401601000061 | 0,2430 | Строительство и обслуживание жилого дома | 9 415 400 | 1 880 000 | 4 385 154 | Ограничений в использовании земель нет |
| 2 | Ракитницкий с/с, д. Задерть, 23А | 122582401601000060 | 0,2500 | Строительство и обслуживание жилого дома | 9 686 600 | 1 930 000 | 3 983 732 | Ограничений в использовании земель нет |

**Организатор аукционных торгов – КУП «Брестский городской центр по управлению недвижимостью».**

Аукцион проводится в соответствии с Положением о порядке организации и проведения аукционов по продаже земельных участков в частную собственность, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 26.03.2008 №462 и состоится при наличии не менее двух участников. В аукционе могут участвовать граждане Республики Беларусь.

**Перечень документов, представляемый участником аукциона:**

заявление на участие в аукционе;

документ, подтверждающий внесение суммы задатка (задатков);

*гражданином* – копия документа, содержащего его идентификационные сведения, без нотариального засвидетельствования;

*представителем гражданина* – нотариально удостоверенная доверенность.

При подаче документов на участие в аукционе граждане, представители граждан предъявляют паспорт или иной документ, удостоверяющий личность.

**Лицо, желающее принять участие в аукционе, обязано** подписать с организатором торгов Соглашение, определяющее взаимные права и обязанности сторон в процессе подготовки и проведения аукциона. Порядок осмотра объекта осуществляется участником аукциона по согласованию с организатором торгов.

**Задаток в размере до 20% от начальной цены предмета аукциона (лота) перечисляется КУП «Брестский городской центр по управлению недвижимостью» на счет № 3012780360011 в филиале № 100 Брестское областное управление ОАО «АСБ Беларусбанк», г. Брест, ул. Московская, 202, код банка 246, УНП 290433924.**

**Победитель аукциона либо единственный участник несостоявшегося аукциона, выразивший согласие на предоставление предмета аукциона по начальной цене, увеличенной на 5%, обязан:**

- в течение 10 рабочих дней со дня утверждения протокола о результатах аукциона либо признания аукциона несостоявшимся в размере, определенном соответствующим протоколом аукционных торгов, осуществить оплату за предмет аукциона, возместить расходы, понесенные бюджетом исполкома по подготовке земельно-кадастровой документации и государственной регистрации земельного участка, а также компенсировать организатору аукциона затраты на организацию и проведение аукциона, в том числе расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам аукциона документации, необходимой для его проведения (окончательный размер которых определяется до аукциона и фиксируется в соответствующих ведомостях ознакомления участников);
- в течение 2 месяцев со дня получения выписки из решения исполкома об изъятии земельного участка для проведения аукциона и предоставлении победителю аукциона либо единственному участнику несостоявшегося аукциона обратиться за государственной регистрацией права частной собственности на земельный участок;
- приступить к освоению земельного участка в течение 1 года со дня получения свидетельства (удостоверения) о государственной регистрации создания земельного участка и возникновения права на него в соответствии с целью и условиями его предоставления (начать строительство);
- снять плодородный слой почвы из под пятна застройки и использовать его для благоустройства участка.

**Аукцион состоится 1 апреля 2014 г. в 11.00 по адресу:** г. Жабинка, ул. Кирова, 65 (зал заседаний).

**Заявки на участие в аукционе принимаются** с 8.30 25.02.2014 г. до 17.30 26.03.2014 г. (перерыв с 13.00 до 14.00; вых.: суб., вс.) по адресу: г. Брест, ул. Ленина, 50.

**Контактные телефоны:** 53 81 92, 53 45 65.

**Сайты:** www.bgcn.by и www.gki.gov.by.

---

# ПРОЕКТНАЯ ДЕКЛАРАЦИЯ

**(о проекте строительства «Жилая многоквартирная застройка со спортивным комплексом (спортивный зал, административно-бытовые помещения) и многоэтажным гаражом-стоянкой в границах улиц Шаранговича, Горецкого в г. Минске. 3-я очередь строительства. Жилой дом № 1 по генплану»)**

**Информация о застройщике**

Открытое акционерное общество «МАПИД», расположенное по адресу: г. Минск, ул. Р.Люксембург, 205, режим работы: понедельник – четверг – 8.30-17.30, пятница – 8.30 – 16.15, обед – 12.45 – 13.30, суббота, воскресенье, государственные праздники – выходной.

